УСЁ ЖЫЦЦЁ – ТЭАТР

ЧЫРВОНКА

ПАЛІВА ДЛЯ СЯБЕ І НА ЭКСПАРТ

12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 САКАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 62 (30196)

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый МІЦКЕВІЧ, начальнік сакратарыята Усебеларускага народнага сходу:

«У склад УНС увойдуць людзі самых розных узростаў і прафесій. У любым грамадскім аб'яднанні: у прафсаюзах, Саюзе жанчын, грамадскім аб'яднанні ветэранаў — прадстаўлены людзі, як мы гаворым, ад малога да вялікага і любой прафесіі: ад рабочага да менеджара. У тым ліку і людзі, якія ўжо не працуюць, знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Якраз такі баланс у складзе Усебеларускага народнага сходу дасць магчымасць стабілізаваць пры неабходнасці сітуацыю і прымаць узважаныя, адказныя рашэнні».

Скарбонка майстэрства

У салігорскім раённым Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі юныя таленты могуць знайсці занятак на любы густ. Напрыклад, школьнікі Міраслаў ЛІПОЎСКІ і Аляксандр АБРАМЧУК займаюцца керамікай у студыі «Скарбонка», якая мае статус заслужанага аматарскага калектыву. Кіруе студыяй Мікалай ПРАТАСЕНЯ, які з задавальненнем перадае сакрэты глінянага майстэрства сваім вучням.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

КАРАТКА

- **Рост экспарту прадпрыемстваў «Белдзяржхарчпрама» па выніках першага квартала складзе больш за 20 % у вартасным выражэнні.**
- БУТБ садзейнічае імпарцёрам беларускай сельгаспрадукцыі з краін Азіі.
- **Тавараабарот паміж Беларуссю і Рэспублікай Адыгея за апошнія пяць гадоў вырас у тры разы.**
- У Беларусі ў якасці альтэрнатывы ўзору міжнароднага сертыфіката тэхнічнага агляду будзе прадстаўлены ўзор нацыянальнай дыягнастычнай карты транспартных сродкаў.

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 24062

Эксклюзіў

Рахматула НАЗАРАЎ:

«УЗБЕКСКА-БЕЛАРУСКАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАПАЎНЯЕЦЦА НОВЫМ ЗМЕСТАМ»

Наша краіна разглядае Узбекістан як стратэгічнага партнёра ў Цэнтральнай Азіі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на прыёме даверчых грамат паслоў замежных краін. У найбліжэйшых планах беларуска-ўзбекскага супрацоўніцтва — рэалізацыя новых прарыўных праектаў і развіццё міжрэгіянальных сувязяў. Аляксандр Лукашэнка выказваў упэўненасць, што Рахматула Назараў, які папрацаваў у Беларусі і добра ведае нашу краіну (да гэтага ён быў часовым павераным у справах Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь), будзе максімальна ўцягнуты ў рэалізацыю дамоўленасцяў, дасягнутых на найвышэйшым узроўні, прыменіць усе свае веды і вопыт для ўмацавання двухбаковых сувязяў. Чаму візіт Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан, які адбыўся ў мінулым месяцы, назвалі гістарычным, што прадугледжвае рэалізацыя маштабнай дарожнай карты супрацоўніцтва, як Якуб Колас і Алішэр Наваі сталі сімваламі дружбы двух народаў, у эксклюзіўным інтэрв'ю газеце «Звязда» распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Узбекістана ў Беларусі Рахматула Назараў.

СТАР. 5

У сезон

ЧАС КЛОПАТУ САДАВОДАЎ

Ідзём па саджанцы

Набліжаецца час пасадкі садоў, і многія садаводы-аматары менавіта цяпер вырашаюць абнавіць «асабістую калекцыю». На якія новыя сарты звыклых пладовых і ягадных культур варта звярнуць увагу? І што з «экзотыкі» прапануюць навукоўцы «дачнікам-наватарам»? З гэтымі пытаннямі мы накіраваліся ў Інстытут пладаводства.

СТАР. 13

Ні адзін добрасумленны прадавец не пабаіцца скарыстацца секатарам. Надрэз павінен быць зялёным: гэта паказвае, што саджанец жывы.

Блізкая ўлада

Разабрацца і дапамагчы

Якія задачы паставіла Наталля КАЧАНАВА падчас асабістага прыёму грамадзян

Традыцыйна ахвотных папрасіць дапамогі ў Старшыні Савета Рэспублікі было шмат. Адно з найбольш частых пытанняў, якія хвалююць грамадзян, — жыллёвае. Менавіта яно прывяло ў сталіцу і жыхароў самых аддаленых рэгіёнаў краіны. Нямала зваротаў паступіла і па лініі жыллёва-камунальнай гаспадаркі: людзі скардзяцца на няякасны капітальны рамонт, нездавальняльнае абслугоўванне жылых дамоў, нежаданне кампетэнтных органаў ліквідаваць наступствы надзвычайных сітуацый. У топе праблем, з якімі грамадзяне прыехалі на асабісты прыём да спікера, — і зямельныя пытанні.

Фота Віктара ІВАНЬКАВА.

У прыватнасці, жыхарка Гродна паведаміла, што ў 2000-х гадах бацькі яе мужа арандавалі пад агародніцтва зямельны ўчастак у шэсць сотак, які знаходзіцца побач з домам, дзе пражывае тры сям'і. Гэтак жа зрабілі і гаспадары іншых кватэр. Да нядаўняга часу ўсе былі задаволены і карысталіся гэтай зямлёй. У мінулым годзе, пасля аб'яўлення «зямельнай амністыі», сям'я Наталлі Юр'еўны вырашыла гэтыя шэсць сотак законна далучыць да ўчастка, які знаходзіцца ва ўласнасці, і выкупіць. Тым больш што цяпер гэта прадугледжана заканадаўствам, згодна з якім грамадзяне маюць права аформіць раней самавольна занятыя ўчасткі. Аднак, нягледзячы на тое што папраўкі ў адпаведны закон ужо ўступілі ў сілу, сям'і заяўніцы адмаўляюць у афармленні гэтага ўчастка.

— Гэтыя кватэры ў вас там прыватызаваны? — удакладніла Наталля Качанава.

— Так, усе ў прыватнай уласнасці, — заўважыла заяўніца.

Як расказаў **намеснік старшыні Шчучынскага райвыканкама Яўген ВІНЧО**, жанчына неаднаразова звярталася ў райвыканкам з просьбай дадаць участак зямлі да яе ўласнасці. «Гэты ўчастак быў вызначаны агульным, для трох чалавек, без вызначэння межаў, — удакладніў ён. — Мы не адмаўляем заяўніцы ў далучэнні гэтага ўчастка. Але для таго, каб гэта зрабіць, яго ў трох сямей мы канфіскуем, вылучаем частку (гэтыя шэсць сотак) і аддаём заяўніку, мяняючы мэтавае прызначэнне ўчастка».

Наталля Качанава запэўніла заяўніцу: пытанне, як паабяцалі мясцовыя органы ўлады, будзе вырашана. «Давайце разбірайцеся, — паставіла яна задачу мясцовай вертыкалі, падкрэсліўшы, што Савет Рэспублікі возьме сітуацыю на кантроль. — Думаю, не будзе ніякіх праблем. Мы ў Шчучыне будзем — паглядзім».

Пра архіважных спецыялістаў і прададзеныя разам з людзьмі кватэры

Жыхарка Мінскага раёна агучыла падчас прыёму пытанне будаўніцтва жылля для медыцынскіх супрацоўнікаў. Алена Іванаўна, якая жыве і працуе ў Бараўлянах, расказала, што там функцыянуе больш за дзесяць медыцынскіх устаноў, а будуюцца супрацоўнікі толькі трох з іх.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што заяўніца ўзняла вельмі важнае пытанне. «Сёння ўстановам аховы здароўя патрэбны не толькі ўрачы, але і фізікі, і хімікі — тыя спецыялісты, якія абслугоўваюць высокатэхналагічнае абсталяванне, — абазначыла яна праблему больш глабальна і заўважыла, што па гэтым пытанні будзе весціся работа з Міністэрствам аховы здароўя. — Нам трэба ўвогуле паглядзець на Бараўляны: хто стаіць на чарзе — і будаваць для іх жыллё. Нам гэтыя спецыялісты архіважныя. Прэзідэнт быў у РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі, імуналогіі, мы гаварылі пра гэта. Сёння гэта вельмі важны цэнтр».

З жыллёвым пытаннем у Савет Рэспублікі прыехала і брастаўчанка Ганна Канстанцінаўна, якая агучыла праблему не толькі ад сябе асабіста, але і ад жыхароў некалькіх дамоў па вуліцы Цаглянай. Жанчына расказала, што дамы былі пабудаваны ў 1946 годзе ад камбіната будаўнічых матэрыялаў. Супрацоўнікам гэтага прадпрыемства кватэры выдаваліся бясплатна. Уласныя квадратныя метры ў свой час там атрымалі і бацькі Ганны Канстанцінаўны.

«Мая сям'я жыла там даволі доўга — гадоў 35, — канкрэтызавала жанчына. — Мы прасілі прадпрыемства выкупіць сваю кватэру, але нам было адмоўлена. У 2016 годзе камбінат будаўнічых матэрыялаў стаў банкрутам і пачаў весці аўкцыёны па продажы гэтага жылля. Нам жа аб гэтым ніхто нічога не казаў. У 2023 годзе мы даведаліся, што праводзяцца аўкцыёны. У гэтым месяцы адбыўся апошні, і нас «прадалі» разам з дамамі».

— Колькі кватэр у доме? — пацікавілася спікер

— Чатыры, — сказала Ганна Канстанцінаўна.

Як расказаў **першы намеснік старшыні Брэсцкага гарвыканкама Юрый КЛІМАХОВІЧ**, усяго на балансе прадпрыемства — 22 такія дамы, да 2018 года 17 дамоў прададзены.

— Куды вы дзявалі жыхароў? — спытала Наталля Качанава.

— Ім прапаноўвалася выкупіць гэтыя кватэры з аўкцыёну або пераехаць у інтэрнат. У інтэрнат ніхто не захацеў пераязджаць, — заўважыў першы намеснік старшыні Брэсцкага гарвыканкама.

Ён паведаміў, што дамы не добраўпарадкаваны (у прыватнасці, адсутнічае цэнтральнае водазабеспячэнне), жыхары самі падводзілі сабе ваду, клапаціліся аб іншых выгодах. Сітуацыя ўскладняецца тым, што, згодна з планам, усе гэтыя дамы ідуць пад знос. «Іншых варыянтаў, акрамя як прадаць іх, у кіраўніцтва прадпрыемства не было, — дадаў Юрый Клімаховіч. — Яны павінны кампенсаваць даўгі крэдыторам. Іншых варыянтаў тут не можа быць».

«Я разумею, што іншых варыянтаў няма, КСМ — банкрут, гэта іх уласнасць, яны павінны яе прадаваць, але там людзі жывуць», — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі.

Мясцовыя ўлады агучылі найбольш аптымальны варыянт вырашэння сітуацыі — даваць жыхарам (а гэта 109 чалавек) гэтых дамоў, якія, дарэчы, ідуць пад знос, арэнднае жыллё. Наталля Качанава пагадзілася, што гэта найбольш прымальны варыянт для людзей.

Юрый Клімаховіч дадаў, што, каб атрымаць арэнднае жыллё, брастаўчане на чарзе стаяць па два-тры гады. «Гэта тое, аб чым мы казалі, калі абмяркоўвалі гэтае пытанне на нарадзе па будаўніцтве, — канкрэтызавала спікер. — Арэнднае жыллё запатрабавана. Значыць, трэба яго будаваць у Брэсце».

«Трэба гэтым людзям дапамагчы, — рэзюмавала спікер. — Разбярыцеся самым сур'ёзным чынам! Ва ўсёй гэтай гісторыі людзі не павінны пацярпець».

У размове з журналістамі Ганна Канстанцінаўна адзначыла, што вельмі ўдзячная Наталлі Іванаўне за магчымасць расказаць пра сваю праблему і дапамогу.

Працаваць або служыць?

Каб расказаць аб сваёй праблеме, Ніна Дзмітрыеўна прыехала ў сталіцу з Калінкавічаў. Як высветлілася, яе сын атрымаў адукацыю ў Мазырскім каледжы будаўнікоў. Пасля заканчэння ўстановы адукацыі маладому чалавеку прыйшла павестка ў армію. У армію ён пайшоў 1 лістапада, а да выканання прафесійных абавязкаў малады чалавек павінен быў прыступіць 1 жніўня. Аднак на работу, куды яго накіравалі па размеркаванні, сын Ніны Дзмітрыеўны не з'явіўся. У сувязі з гэтым стаіць пытанне аб кампенсацыі грашовых сродкаў за навучанне ў каледжы. Жанчына пацікавілася, ці можна, каб служба ў арміі была залічана ў адпрацоўку па размеркаванні.

Як патлумачыў **першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ**, малады чалавек павінен быў выйсці на работу, атрымаць статус маладога спецыяліста. «І калі б пасля гэтага яго прызвалі ў армію, тады ён атрымліваў бы ўсе сацыяльныя гарантыі, а тэрмін службы ў арміі быў бы залічаны ў адпрацоўку па размеркаванні, аднак малады чалавек не прыступіў да работы», — удакладніў ён.

Наталля Качанава не апраўдвае ўчынак маладога чалавека, але нагадвае, што нярэдка разглядаюцца пытанні, калі хлопцы ўхіляюцца ад службы ў арміі. Тут жа іншы выпадак — малады чалавек з вялікім задавальненнем пайшоў служыць ва ўнутраныя войскі МУС. Больш за тое, плануе заключыць з воінскай часцю кантракт. У сувязі з сітуацыяй, якая склалася, Старшыня Савета Рэспублікі парэкамендавала Міністэрству адукацыі ўнесці прапановы, як можна дапамагчы гэтай сям'і, для якой кампенсацыя за навучанне — непад'ёмная сума.

«Прывітанне вашаму хлопчыку перадавайце, няхай служыць годна», — рэзюмавала Наталля Качанава, звяртаючыся да заяўніцы.

Вераніка КАНЮТА.

З якімі яшчэ пытаннямі грамадзяне звярталіся да Наталлі Качанавай, чытайце падрабязна ў найбліжэйшым нумары «МС».

Падзея

Захаваецца сацыяльная накіраванасць у сферы будаўніцтва жылля

Пра гэта на адкрыцці Міжнароднай архітэктурна-будаўнічай выставы BUDEXPO-2024 паведаміў першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Алег ШВЕЦ.

У прыватнасці, ён заявіў, што ў мінулым годзе было пабудавана 4,3 мільёна квадратных метраў жылля, а сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 4,4 мільёна «квадратаў». Падрыхтаваны праграмы па будаўніцтве жылля, і яны выконваюцца. Дарэчы, плануецца больш будаваць арэнднага жылля. Міністэрства разлічвае, што цэнтралізавана будзе ўзводзіцца выключна энергаэфектыўнае жыллё, а таксама будзе падтрымана больш масавае будаўніцтва электрадамоў.

Фота Кацярыны УРБАН.

На працягу ўжо 26 гадоў гэты праект выставы з'яўляецца вядучай і асноўнай пляцоўкай для камунікацыі спецыялістаў галіны. BUDEXPO аб'ядноўвае вытворцаў будаўнічых і аздобных матэрыялаў, пастаўшчыкоў і спажыўцоў, вядучыя архітэктурныя і дызайн-бюро, будаўніча-мантажныя і дэвелаперскія кампаніі, навуковыя і праектныя арганізацыі, дзяржаўныя прадпрыемствы, профільныя навучальныя ўстановы.

Алег Швец асобна адзначыў, што выстава сёлета знакавая, таму што амаль у два разы павялічылася колькасць кампаній-удзельніц. Калі летась на мерапрыемстве ўдзельнічала каля 40 кампаній, то цяпер — ужо больш за 70 арганізацый. Максімальнае прадстаўніцтва адзначаецца ад Расіі, у прыватнасці, шырока прадстаўлена Варонежская вобласць. Менавіта на тэрыторыі гэтага рэгіёна нашымі будаўнікамі рэалізаваны праекты федэральнага маштабу.

Старшыня Саюза будаўнікоў Беларусі Анатоль НІЧКАСАЎ распавёў, што аналагічнае мерапрыемства ў 2025 годзе плануецца арганізаваць ужо ў новым будынку для правядзення выстаў міжнароднага ўзроўню: «Мы заключылі з «БелЭкспа» пагадненне аб сумеснай дзейнасці. Будзем прыкладаць усе намаганні, каб выстава праводзілася і развівалася. Колькасць ахвотных прадэманстраваць тут сваю прадукцыю не змяншаецца. Прыемна, што сёння прадстаўлены інавацыйныя і традыцыйныя матэрыялы, прысутнічаюць флагманы прамысловай будіндустрыі, свае праекты паказалі архітэктары».

На працягу трох дзён (27—29 сакавіка) вядучыя айчынныя і замежныя кампаніі будуць дэманстраваць перадавыя матэрыялы, тэхналогіі і паслугі, будаўнічую тэхніку і абсталяванне, уласныя распрацоўкі і тэхнічныя рашэнні, якія ахопліваюць усе этапы ўзвядзення будынкаў і аздаблення памяшканняў.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У амерыканскім штаце Мэрыленд увялі надзвычайны рэжым з-за абвальвання моста ў Балтымары

У штаце Мэрыленд уведзены рэжым надзвычайнага становішча з вялікай колькасцю пацярпелых з-за абвальвання моста ў горадзе Балтымар. Пра гэта на сваёй старонцы ў сацсетцы X паведаміў губернатар штата Уэс Мур. «Мы працуем з міжведамаснай групай, каб аператыўна задзейнічаць федэральныя рэсурсы», — напісаў ён. Мур дадаў, што яго каманда «знаходзіцца ў цесным кантакце» з міністрам транспарту ЗША, мэрам Балтымара (у горадзе таксама абвешчаны надзвычайны рэжым). Як вядома, кантэйнеравоз Dali пад сінгапурскім сцягам урэзаўся ў апору аўтамабільнага моста Фрэнсіса Скота Кі (Кэй Брыдж), што прывяло да абвальвання збудавання даўжынёй звыш 2,5 кіламетра ў раку Патапска і прыпыненне руху суднаў у порт Балтымар і назад. Пасля абвальвання моста як мінімум шэсць чалавек лічацца зніклымі без вестак. Эксперты прагназуюць значныя наступствы для эканомікі ЗША і сур'ёзныя збоі ў глабальных ланцужках паставак.

Вялікабрытанія аб'явіла аб намеры развіваць ядзерныя ўзбраенні

Прэм'ер Вялікабрытаніі Рышы Сунак абвясціў аб пакеце мер па развіцці ядзернага арсенала краіны, у тым ліку атамных падводных лодак (АПЛ). Сунак, у прыватнасці, заявіў аб інвеставанні 200 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў у развіццё суднаверфі, якая займаецца будаўніцтвам АПЛ, у Бароў-ін-Фернэс. Акрамя таго, брытанскі ўрад выдзеліць не менш чым 763 мільёны фунтаў стэрлінгаў на працяг наступных чатырох гадоў на навучанне супрацоўнікаў ядзернай галіны.

Цэны на какава-бабы ўпершыню ў гісторыі перавысілі 10 тысяч долараў за тону

Каціроўкі на какава ў чарговы раз абнавілі гістарычны максімум на апасеннях дэфіцыту прапановы. Майскія ф'ючарсы на гэтую сыравіну ў Нью-Ёрку падчас таргоў падаражэлі амаль на чатыры працэнты і перавысілі 10 тысяч долараў за тону. З пачатку года каціроўкі падскочылі ў 2,4 раза, за апошнія пяць сесій — больш як на 20 працэнтаў. Як паведамлялася, у Кот-д'Івуары, найбуйнейшым пастаўшчыку какавы ў свеце, усталявалася анамальна спякотнае надвор'е, што пагражае ўраджаю какава-бабоў.

З нагоды

Усе пытанні — пад кантролем

Адбылося сумеснае пасяджэнне рабочых груп Савета Рэспублікі і Апарату Савета Федэрацыі па падрыхтоўцы XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Мерапрыемства прайшло ў верхняй палаце беларускага парламента пад кіраўніцтвам намесніка старшыні камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА.

Сустрэча пачалася з хвіліны маўчання ў памяць аб бязвінных ахвярах, якія загінулі падчас тэракта ў Падмаскоўі.

Падчас пасяджэння былі абмеркаваны пытанні падрыхтоўкі аб'ектаў, арганізацыі дзелавой і культурнай праграм маючага адбыцца Форуму. У прыватнасці, дэталі секцыйных і пленарнага пасяджэнняў, сустрэчы з кіраўнікамі рэгіёнаў Беларусі і Расіі, падрыхтоўкі да падпісання пагадненняў аб супрацоўніцтве і кантрактаў. Асаблівая ўвага — арганізацыя выставы дасягненняў народнай гаспадаркі дзвюх краін. Закранулі таксама аспекты лагістыкі, пражывання і жыццезабеспячэння ўдзельнікаў і гасцей мерапрыемства. Вядзецца падрыхтоўка да канцэрта майстроў мастацтваў.

Як падкрэсліў Міхаіл Русы, Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі сёлета праходзіць у крыху зменены фармаце. «Задзейнічалі не толькі Віцебск, але і два гарады — Полацк і Наваполацк, для таго каб як мага больш аб'ектаў і суб'ектаў гаспадарання ўключалася ў гэту работу, — удакладніў сенатар. — Крыху мяняецца звычайная адпрацаваная структура падрыхтоўкі, бо трэба прадумаць лагістыку і іншае, але думаю, што гэта ўсё вырашальна».

На асаблівым кантролі, як заўважыў Міхаіл Русы, — пытанні прыбыцця і размяшчэння ўдзельнікаў Форуму. «Усё ўзята пад кантроль, — адзначыў сенатар. — За кожным аб'ектам замацаваны людзі».

Кажучы аб секцыйных пасяджэннях, парламентарый паведаміў, што будзе працаваць дзевяць секцый. «Вызначыліся з іх складам, адпрацавана і ўзгоднена тэматыка, — падкрэсліў Міхаіл Русы. — На 95—97 % ёсць і выступоўцы па гэтых тэмах».

Па словах **старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрыя ДЗЯМІДАВА**, з кожным годам гэтае мерапрыемства набірае ўсё большыя маштабы, прыцягвае значную колькасць кіраўнікоў рэгіёнаў — як Расійскай Федэрацыі, так і Рэспублікі Беларусь. «Абмяркоўваюцца пытанні сацыяльнага ўзаемадзеяння, правядзення сумесных гуманітарных праектаў, эканамічныя пытанні, магчымасць далейшага інавацыйнага развіцця, супрацоўніцтва ў сферы адукацыі — практычна ўвесь спектр нашага ўзаемадзеяння з расійскімі рэгіёнамі разглядаецца на Форуме, падпісваюцца новыя пагадненні, выходзім на новыя праекты. І кожны год гэтае мерапрыемства прыцягвае ўсё больш новых удзельнікаў».

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Вяршыня народаўладдзя

ФАРМІРАВАННЕ БУДУЧЫНІ — КЛОПАТ АГУЛЬНЫ

Да электаральнай кампаніі далучыліся амаль усе арганізацыі паўночнага рэгіёна

«Сёння мы вылучаем кандыдатаў у новы канстытуцыйны орган — Усебеларускі народны сход, які будзе працаваць пяць гадоў. Упэўнены, што практычна ўсе нашы жанчыны вартыя ўдзельнічаць у гэтым веча. Дэлегаты — самыя актыўныя прадстаўнікі жаночага руху — данясуць намеры і пажаданні ад усёй шматлікай арганізацыі вобласці», — адзначыў на пасяджэнні Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын намеснік старшыні аблвыканкама Вячаслаў ДУРНОЎ.

РОЛЯ ЖАНЧЫНЫ

Члены абласной арганізацыі БСЖ абралі 10 кандыдатаў у дэлегаты, сярод якіх — прадстаўнікі розных сфер: адукацыі, аховы здароўя, гандлю, ЖКГ, эканомікі, бізнесу і іншых. «Кожнаму з нас неабыякавы лёс нашай краіны. Мы, беларускія жанчыны, гатовыя працаваць, выхоўваць дзяцей, удзельнічаць у грамадскім жыцці, але перш за ўсё спадзяёмся на захаванне міру і згоды», — падкрэсліла старшыня Шумілінскай раённай арганізацыі БСЖ Святлана Цімашэнка.

«Мы абралі 10 дэлегатаў на Усебеларускі народны сход ад нашага грамадскага аб'яднання. Гэта 10 актывістак, сапраўдных патрыётак сваёй Радзімы. Гэта прафесіяналы сваёй справы, жанчыны з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якія рэалізаваліся як мамы, бабулі. Гэта тыя людзі, якія могуць весці за сабой людзей. Вельмі шырокае прадстаўніцтва, выбраны найлепшыя з найлепшых. Думаю, што яны ўсе годна прадставяць наш саюз на Усебеларускім народным сходзе», — заключыла начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама, старшыня абласной арганізацыі БСЖ Марына Навіцкая.

ДАВЕР, ЗАСЛУЖАНЫ МУДРАСЦЮ

На пленуме Віцебскага абласнога савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў прагаласавалі за вылучэнне 10 прадстаўнікоў абласной арганізацыі кандыдатамі ў дэлегаты Усебеларускага народнага сходу.

У ліку кандыдатаў у дэлегаты — Уладзімір Андрэйчанка, які раней займаў пасаду Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня абласнога Савета БГАВ Сяргей Альсевіч, а таксама намеснік старшыні абласнога савета БГАВ — старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валяр'ян Мацкевіч, шэраг кіраўнікоў раённых і першасных структур абласной арганізацыі.

У ліку вылучэнцаў — старшыня Віцебскай раённай арганізацыі ветэранаў Ніна Казлова. Яна адзначыла, што быць кандыдатам у дэлегаты УНС — вялікі гонар. «Я буду прадстаўляць абласную ветэранскую арганізацыю, гэта вельмі адказна. Хацелася б вырашыць пытанні па нашай ветэранскай арганізацыі, працаваць на яе ўмацаванне, больш увагі ўдзяляць увекавечанню памяці загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, добраўпарадкаванню памятных і месцаў пахаванняў», — падкрэсліла Ніна Васільеўна.

ПАД СЦЯГАМ «БЕЛАЙ РУСІ»

На канферэнцыі Віцебскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» вылучылі дзесяць кандыдатаў у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад суб'екта грамадзянскай супольнасці. Выбары дэлегатаў пройдуць 6 красавіка на пазачарговым з'ездзе грамадскага аб'яднання, дзе Віцебшчыну будуць прадстаўляць 47 дэлегатаў.

Сярод абраных кандыдатаў — член Рэспубліканскага Савета РГА «Белая Русь», намеснік генеральнага дырэктара абутковага холдынга «Марка» Мікалай Мартынаў, старшыня Віцебскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» Вольга Разанава, машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо «Полацкае» УП «Віцебскае аддзяленне БЧ» Уладзімір Свяцкі, медсястра Сенненскай цэнтральнай раённай бальніцы Юлія Голубева і іншыя.

«Займаючыся фарміраванем такога ўсенароднага органа кіравання, безумоўна, важна памятаць пра тых людзей, якія, можа, і не сталі вялікімі кіраўнікамі, але з'яўляюцца прафесіяналамі з багатым жыццёвым вопытам, якія многія гады прысвяцілі працы на вытворчасці, з'яўляюцца патрыётамі краіны. Таму пры выбары кандыдатаў мы зрабілі акцэнт на тых, хто працуе на зямлі. Гэта годныя людзі, іх ведаюць у сваіх рэгіёнах і за межамі вобласці. Я ўпэўнены, што яны на высокім узроўні будуць прадстаўляць нашу грамадскую арганізацыю на УНС», — адзначыў старшыня абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» Уладзімір Цярэнцьеў.

ПРАФСАЮЗНАЯ ГРАМАДСКАСЦЬ

«Абласное аб'яднанне прафсаюзаў выбірала кандыдатаў у дэлегаты УНС шляхам сур'ёзных абмеркаванняў. Гэта людзі, адданыя нашай дзяржаве, яны прафесіяналы ў сваёй сферы, шмат зрабілі для Віцебскай вобласці. Кожны з іх валодае дастатковымі кампетэнцыямі, каб прымаць узважаныя рашэнні, каб наша краіна і далей магла развівацца і ствараць усе ўмовы для чалавека працы», — адзначыў член Савета Рэспублікі, старшыня абласнога аб'яднання прафсаюзаў Юрый Дзеркач.

На Віцебшчыне 98 працэнтаў насельніцтва, занятага ў эканоміцы, уваходзіць у склад самай масавай грамадскай арганізацыі краіны. Членамі абласнога аб'яднання прафсаюзаў абрана 10 кандыдатаў у дэлегаты УНС, сярод іх — заслужаныя работнікі і маладыя спецыялісты. Вылучана кандыдатам у дэлегаты і старшыня пярвічнай арганізацыі Гарадоцкага прадпрыемства кацельняў і цеплавых сетак Людміла Рудакова. Яна падкрэсліла, што ёй яшчэ раз хацелася б звярнуць увагу на занятасць у малых раёнах, павышэнне ўзроўню жыцця і заработнай платы. «У сферы ЖКГ працую доўгі час і ведаю праблемы галіны знутры. Таксама лічу важнай праблему бяспекі не толькі для чалавека працы, але і краіны. Таму людзі, якіх абяруць, — гэта ініцыятыўныя, творчыя, патрыёты роднай Беларусі, ім важна і надалей захоўваць мір і суверэнітэт».

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ПРАЙСЦІ ЗНАКАВЫ МОМАНТ У ГІСТОРЫІ КРАІНЫ РАЗАМ

На Гомельшчыне ад райсаветаў і Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў вылучаны 22 кандыдаты ў дэлегаты Усебеларускага народнага сходу

Сваіх прадстаўнікоў ад рэгіёна — па 10 чалавек ад кожнай арганізацыі — вылучылі абласныя арганізацыі «Беларускага саюза жанчын», «Белай Русі», БРСМ і Савета ветэранаў.



На пасяджэнні прэзідыума старшыня Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Алена Алексіна звярнула ўвагу прысутных на парадак, умовы вылучэння кандыдатаў, патрабаванні, якія прад'яўляюцца да іх. Пасля абмеркавання дэпутаты прапанавалі дзве кандыдатуры. Так, кандыдатамі ў дэлегаты Усебеларускага народнага сходу былі вылучаны намеснік старшыні Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў, рэктар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога Артур Пуцята і дэпутат гарсавета, урач-анколаг-хірург Гомельскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера Уладзіслаў Воўчак.

— Мы праходзім знакавы момант у гісторыі. Упершыню фарміруецца ў канстытуцыйным статусе Усебеларускі народны сход, і, безумоўна, гэта вялікі гонар — быць сярод прадстаўнікоў нашай краіны, якія вылучаюцца ў дэлегаты. Я дзякую за аказаны давер Гомельскаму гарадскому Савету дэпутатаў за такі статус і ўпэўнены, што прыкладу ўсе намаганні для таго, каб абараняць інтарэсы як Гомеля, так і Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў Артур Пуцята.

Другі кандыдат у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу — Уладзіслаў Воўчак — самы малады дэпутат Гомельскага гарсавета дэпутатаў. Ён звярнуў увагу на вялікую адказнасць і вялікі давер, якіх удастойваецца беларуская моладзь.

— Для мяне высокі гонар стаць кандыдатам у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. У моладзі Беларусі ёсць усе магчымасці рэалізаваць свае таленты. Што датычыцца мяне, я прыкладу ўсе намаганні для развіцця аховы здароўя, правядзення навуковых даследаванняў, асабліва ў сферы анкалогіі, у якой працую, — адзначыў малады дэпутат.

Дзесяць кандыдатаў у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу былі вылучаны падчас справаздачнай канферэнцыі Гомельскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь».

Па словах **старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Галіны ЦЯРЭШЧАНКІ**, годных стаць кандыдатам у дэлегаты шмат. Абраныя ад абласной арганізацыі кандыдаты будуць прадстаўляць розныя сацыяльныя катэгорыі грамадства.

— Пры выбары кіраваліся асноўнымі патрабаваннямі. Па-першае, чалавек павінен адбыцца як прафесіянал, па-другое, мець рэальныя вынікі работы і, па-трэцяе, рабіць уклад у грамадскае жыццё Гомельскай вобласці, — дадала Галіна Цярэшчанка.

Удзел у абласной канферэнцыі па вылучэнні кандыдатаў у дэлегаты УНС прынялі каля 70 членаў Гомельскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз жанчын». З усіх раёнаў вобласці і абласнога цэнтра вылучаны жанчыны, вядомыя не толькі на Гомельшчыне, але і ў краіне. Кандыдатамі ў дэлегаты ад БСЖ абралі дзесяць прадстаўніц рэгіёна.

— Жанчыны былі рэкамендаваны для разгляду на канферэнцыі раённымі арганізацыямі, на раённых канферэнцыях. Яны вядомыя сваёй актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, бралі ўдзел і ў конкурсе «Жанчына года», а таксама ў абласных і рэспубліканскіх конкурсах, — распавяла **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз жанчын» Алена КЛІЧКОЎСКАЯ.**

Наталля КАПРЫЛЕНКА, Фота ТК «Гомельшчына афіцыйна».

«Бачылі ў жыцці шмат, але такой прыгажосці — ніколі»

Ветэраны Мінскай вобласці пабывалі на экскурсіі ў Палацы Незалежнасці

Чарговую экскурсію па Палацы Незалежнасці правялі для ветэранаў сталічнага рэгіёна. На ёй прысутнічалі актывісты ветэранскага руху Пухавіцкай раённай арганізацыі ветэранаў і ветэраны з гарадскога пасёлка Свіслач, самаму старэйшаму з якіх 86 гадоў.

Пухавіцкая раённая арганізацыя налічвае 29 пярвічных арганізацый ветэранаў, якія аб'ядноўваюць 14 500 ветэранаў, у тым ліку 15 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Каля трох гадзін госці вывучалі інтэр'ер і залы Палаца Незалежнасці, а таксама даведваліся аб падрабязнасцях ключавых падзей, якія тут праводзяцца: найважнейшыя міжнародныя сустрэчы, нарады, цырымоніі ўзнагароджання. Ім таксама расказалі аб рабоце беларускіх дызайнераў, будаўнікоў, скульптараў і мастакоў, якія ўдзельнічалі ва ўзвядзенні і афармленні рабочай рэзідэнцыі Прэзідэнта.

Сярод экскурсантаў прысутнічалі старшыня ветэранскай арганізацыі адукацыі і навукі Пухавіцкага раёна Ала Васільеўна Ралькевіч, якая працавала дырэктарам Пухавіцкай гімназіі, была членам Савета Рэспублікі другога і трэцяга скліканняў, узнагароджана ордэнам Пашаны і знакам «Выдатнік адукацыі», а таксама першы намеснік старшыні Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Дзмітрый Анатольевіч Банчук, ветэран Узброеных Сіл, палкоўнік запасу.

Экскурсія пачалася ў самай вялікай зале ўрачыстых цырымоній умяшчальнасцю каля тысячы чалавек. Гасцям распавялі, што найважнейшыя палітычныя падзеі ў нашай краіне праходзяць менавіта тут. Напрыклад, у асаблівых выпадках Прэзідэнт тут уручае дзяржаўныя ўзнагароды. Кожная з залаў Палаца Незалежнасці, выходзячы з яе канкрэтнага прызначэння, мае асаблівую атмасферу.

Госці знаходзіліся пад вялікім уражаннем ад велічы ўбачанага.

— Эмоцыі неверагодныя. Ідучы ў палац, дарэчы, самі сабой успамінаюцца радкі са знакамітых твораў беларускіх паэтаў. Пачуццё патрыятызму, міралюбнасці і шчасця перапаўняюць маё сэрца. Да слёз ганарымся нашым Прэзідэнтам і квітнеючай Беларуссю, — падзялілася Людміла Бельская.

Гасцей вельмі ўразіў будынак Палаца Незалежнасці і ўладкаванне яго залаў і кабінетаў. Яны ўсміхаліся, фатаграфавалі і абменьваліся думкамі паміж сабой.

— Я шмат чаго за жыццё бачыў, таму што працаваў у сферы энергетыкі больш за 50 гадоў, часта бываў у камандзіроўках па Савецкім Саюзе, але такой прыгажосці — ніколі, — падзяліўся ўражаннямі Рышард Календа. — Пабываць у палацы было маёй марай, якая здзейснілася. Такая магчымасць даецца не кожнаму. Распавяду сваім родным і сябрам, што пабачыў тут.

Ганна Канаш выступіла галоўным ініцыятарам па арганізацыі экскурсіі і праявіла немалую настойлівасць, каб група ветэранаў змагла трапіць у Палац Незалежнасці, бо чарга з ахвотных вельмі вялікая.

— Як раней казалі: «Убачыць Парыж і памерці». А я цяпер буду казаць, што паглядзела Палац Незалежнасці, і ўжо можна памерці, — расказала яна. — Але мы хочам, вядома, жыць. Нам падоўжылі жыццё на некаторы час. Ад такога ўражання мы пра ўсе хваробы забыліся. Мы глядзім, разявіўшы раты. Вельмі задаволены, што трапілі сюды. Гэта, вядома, казка. І нават лепш.

Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.

ПаБАЗАРым

33-ці валошкавы сезон

На вуліцы вясна, а гэта значыць, што да галоўнай культурнай падзеі краіны засталося крыху больш чым тры месяцы. Сёлета Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе ў паўночнай сталіцы ў трыццаць трэці раз, традыцыйна сабраўшы на гасціннай віцебскай зямлі таленты з усяго свету пад лозунгам «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

Пад купалам амфітэатра

Будучы фестываль ізноў стане здзіўляць прыхільнікаў і даўніх сяброў форуму сюрпрызамі і ўжо ўпадабанымі гледачу падзеямі. Па словах **дырэктара «Славянскага базару ў Віцебску» Глеба ЛАПІЦКАГА**, галоўным дасягненнем арганізатараў з'яўляецца тое, што фестываль стаў сусветна вядомым культурным брэндам і не згубіў больш чым за тры дзесяцігоддзі сваю «душу». Гэта атмасфера натхнення і творчасці, адзінства і сяброўства народаў свету, яркі ліпеньскі тыдзень, якога многія чакаюць цэлы год.

Сёлета на галоўнай фестывальнай пляцоўцы — у Летнім амфітэатры — асобны канцэрт будзе прысвечаны дзіцяча-юнацкай аўдыторыі. «Госці з будучыні» — такую назву носіць мерапрыемства з удзелам юных талентаў і блогераў. Напярэдадні мерапрыемства будуць абраны дзесяць юных мастакоў, якія стануць пераможцамі конкурсу малюнкаў «Віцебск. Лета. Фестываль», — іх у якасці пачэсных гасцей таксама запросяць на канцэрт.

«У гэтым годзе нарэшце на галоўную сцэну паднімуцца ўдзельнікі дзіцячага вакальнага конкурсу, для многіх гэта мара. Пад купалам у сэрцы горада на Дзвіне адбудуцца лёсаванне і прэзентацыя канкурсантаў», — адзначыў Глеб Лапіцкі.

Для прыхільнікаў рок-музыкі арганізатары фестывалю таксама падрыхтавалі прыемны падарунак: на «Славянку» зноў вяртаецца «Рок-панарама». Сёлета на канцэрце 10 ліпеня будзе выступаць Сімфанічны аркестр Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна. У яго выкананні прагучаць найлепшыя хіты сусветнай, савецкай і сучаснай рок-сцэны. Акрамя гэтага, у Віцебску выступіць Аляксей Гаршанёў з добра вядомымі ўсім песнямі гурта «Король и Шут». Яшчэ адным госцем канцэрта стане рускі трыб'ют гурта «Scorpions».

Афіцыйнае адкрыццё фестывалю адбудзецца 11 ліпеня, а на наступны дзень у амфітэатры пройдзе гала-канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...» У ноч з 12 на 13 ліпеня «Залаты хіт» традыцыйна збярэ самых яркіх прадстаўнікоў сцэны 1990-х і 2000-х гадоў. Сярод артыстаў значацца Bassara, «Винтаж», «Дискомафия» і спецыяльны госць Томас Н'эвергрын.

13 ліпеня на сцэне амфітэатра стартуе 33 Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск», у першым аддзяленні канкурсанты выканаюць славянскі хіт у суправаджэнні аркестра, другое аддзяленне адкрые хор Турэцкага.

14 ліпеня папулярныя каманды Вышэйшай лігі Клуба Вясёлых і Знаходлівых сыдуцца ў гумарыстычным паядынку за Кубак «Славянскага базару». Навінкай сёлета стане ўдзел у Кубку маладых беларускіх камандаў. Вечарам гэтага дня адбудуцца цырымоніі ўрачыстага закрыцця форуму мастацтваў і другі этап конкурсу выканаўцаў эстраднай песні, падчас якога ўдзельнікі выканаюць сусветны хіт. Святочным акордам на галоўнай сцэне форуму стане канцэрт «Шансон ТБ — усе зоркі».

Дарэчы, квіткоў на адкрыццё і закрыццё «Славянскага базару», а таксама на ўлюбёныя гала-канцэрты амаль не засталося. Паспяшайцеся набыць свой пропуск у фестывальнае лета!

Танцы пад адкрытым небам

Фестывальная пляцоўка каля канцэртнай залы «Віцебск» задзейнічана толькі трэці год, але фармат open-air так моцна адгукнуўся ў гасцей і жыхароў горада на Дзвіне, што арганізатары сёлета пашыраюць яе магчымасці.

«Напэўна, у кожнага, хто трапляе ў Віцебск на адкрыццё фестывалю, пасля традыцыйнага святочнага салюта застаецца пачуццё, быццам бы чагосьці не хапіла? Хочацца цэлую ноч гуляць па горадзе, танцаваць і весяліцца. У гэтым сезоне мы стварылі новы праект «Танцпляцоўка з «Душэўным радыё», які стартуе пасля цырымоніі адкрыцця», — распавёў дырэктар фестывалю. Да чатырох гадзін раніцы для гасцей будуць выступаць гурт «На-На», рэпера-вумэн-трыа «Розовые розы», гурт «Cosa Nostra» і іншыя.

Як доказ таго, што «Славянскі базар» не мае межаў і на ім можа выступіць кожны, дырэкцыя запусціла конкурс сярод кавербэндаў. Найлепшы зможа выступіць на начным канцэрце нараўне з зоркамі айчыннай і замежнай эстрады.

10-га чысла ўсіх жадаючых запросіць маладзёжны праект «Рытмы лета», у рамках якога на сцэну выйдуць Filatov&Karas, BURITO, Арцём Качар і іншыя. 13 ліпеня на адкрытай пляцоўцы выступіць адна з мацнейшых вакалістак сучаснасці Ані Лорак, якая прывязе ў Віцебск шоу «The Best», напоўненае хітамі. Традыцыйна ў фармаце open-air пройдуць Дні моладзі.

Новы фестывальны год — у новай зале

Канцэртная зала «Віцебск» парадуе жыхароў і гасцей горада новым знешнім і ўнутраным аблічам. Плеяду фестывальных падзей на гэтай пляцоўцы 9 ліпеня адкрые VI Міжнародны танцавальны праект «Dream Dance Fest». Увечары Ягор Дружынін там жа прадставіць свой пластычны спектакль «Усюды жыццё».

Днём 10-га чысла пройдзе першы дзень XXII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск», крыху пазней канцэртная зала загучыць хітамі «Марачка», «Есаул», «Ясныя дні» — на сцэну выйдзе Алег Газманаў.

12 ліпеня адбудзецца цырымонія ўзнагароджання і гала-канцэрт па выніках дзіцячага музычнага конкурсу. «Нарэшце ў «Славянскага базару» з'явіцца фестываль-пабраціім. Гэта той паказчык, што мы не замыкаемся толькі на славянскай культуры. Форум мастацтваў — гэта пляцоўка для адкрытага дыялогу ўсіх культур і народаў свету», — анансаваў Глеб Лапіцкі. Так, упершыню ў Віцебск прыедзе фестываль «KAVKAZ MUSIC FEST», які быў заснаваны ў Нальчыку два гады таму пад уражаннем арганізатараў ад віцебскага форуму. На сцэну паўночнай сталіцы выйдуць самыя папулярныя артысты каўказскай эстрады з Адыгеі, Дагестана, Паўночнай Асеціі і іншыя.

13 ліпеня ў КЗ пройдзе канцэрт у рамках Дзён Саюзнай дзяржавы, вечарам сваю праграму пад назвай «Шчаслівым быць!» прадставіць народны спявак Яраслаў Сумішэўскі. 14-га чысла на сольны канцэрт запрашае Вікторыя Алешка, а 15 ліпеня па шматлікіх просьбах зорка рускага шансона Любоў Успенская выступіць з юбілейным канцэртам.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

«УЗБЕКСКА-БЕЛАРУСКАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАПАЎНЯЕЦЦА НОВЫМ ЗМЕСТАМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Спадар пасол, дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Узбекістанам былі ўстаноўлены больш як 30 гадоў таму. Чаго ўдалося дабіцца за гэты час?

— За больш чым тры дзясяткі гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма дзяржавамі ў студзені 1993 года двухбаковае супрацоўніцтва паслядоўна развіваецца на аснове прынцыпаў узаемнай павагі і ўліку інтарэсаў адно аднаго. Развіццё супрацоўніцтва з Беларуссю займае важнае месца ў знешняй палітыцы Узбекістана. У мінулым годзе нашы краіны перасягнулі 30-гадовую мяжу з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін. За гэты кароткі па гістарычных мерках тэрмін Ташкент і Мінск здолелі выбудаваць па-сапраўднаму цесныя, даверныя сувязі.

Магутны рывок пашырэння супрацоўніцтва адбыўся пасля афіцыйных візітаў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан у верасні 2018-га і Прэзідэнта Рэспублікі Узбекістан Шаўката Мірзіёева ў Беларусь у ліпені — жніўні 2019-га. Па выніках афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан у 2018-м падпісана 19 міжнародных дакументаў па прыярытэтных напрамках супрацоўніцтва, прэм'ер-міністрамі дзвюх краін зацверджаны План мерапрыемстваў («Дарожная карта») па развіцці супрацоўніцтва. У рамках візіту адбыўся ўзбекска-беларускі бізнес-форум дзелавога і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, а таксама выстава беларускіх вытворцаў Made in Belarus. У ходзе афіцыйнага візіту Прэзідэнта Узбекістана ў Беларусь у 2019-м падпісана 12 міжурадавых і міжведамасных дагавораў, арганізаваны І Форум рэгіянаў Беларусі і Узбекістана, Нацыянальная выстава ўзбекскай прадукцыі Made in Uzbekistan і Дні культуры Узбекістана. Актывізацыя дыялогу на найвышэйшым узроўні садзейнічала інтэнсіфікацыі абмену дэлегацыямі.

— Паміж нашымі краінамі наладжаны актыўны дыялог на найвышэйшым узроўні. Як гэта спрыяе развіццю двухбаковага ўзаемадзеяння?

— У апошнія гады ўзбекска-беларускае ўзаемадзеянне выйшла на яшчэ больш высокі ўзровень, што дазволіла раскрыць шырокі патэнцыял нявыкарыстаных рэзерваў у супрацоўніцтве. Пераважна гэта стала магчымым дзякуючы актыўнаму і адкрытаму палітычнаму дыялогу, наладжанаму паміж кіраўнікамі дзвюх дзяржаў — Шаўкатам Мірзіёевым і Аляксандрам Лукашэнкам. Акрамя таго, лідары дзвюх краін рэгулярна праводзяць двухбаковыя сустрэчы на палях СНД, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і іншых міжнародных структур. Іх рэгулярныя зносіны, у тым ліку на розных міжнародных пляцоўках, задаюць новы тон адносінам нашых дзяржаў. Лідары стварылі ўсе ўмовы, заклалі трывалы фундамент для збліжэння дзвюх дружалюбных краін і народаў, для цеснай кааперацыі ва ўсіх сферах і галінах.

Напрыклад, высокую інтэнсіўнасць набыў абмен дэлегацыямі на розных узроўнях. З 2017 года ажыццёўлена больш за 150 двухбаковых візітаў і іх колькасць няўхільна расце. Наладжана цеснае ўзаемадзеянне і прадаўжаюцца актыўныя кантакты на ўзроўні ўрадаў, парламентаў, міністэрстваў і ведамстваў, рэгіёнаў і галін. Асаблівае значэнне ў прасоўванні канструктыўнага супрацоўніцтва маюць міжпарламенцкія сувязі, якія пашыраюцца. У гэтым вялікая заслуга Міжпарламенцкіх груп па супрацоўніцтве паміж Олій Мажлісам Рэспублікі Узбекістан і Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь.

Флагманам развіцця ўзбекска-беларускага ўзаемадзеяння на сёння прадаўжае заставацца гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае партнёрства, што пацвярджаецца ўстойлівым ростам двухбаковага тавараабароту. Дзякуючы агульным намаганням, упершыню ў гісторыі адносін Узбекістана і Беларусі, узровень узаемнага гандлю ў 2022 годзе перавысіў паўмільярдную адзнаку. У той перыяд па выніках года двухбаковы тавараабарот склаў 536 мільёнаў долараў

ЗША (рост на 44 працэнты ў параўнанні з 2021-м) і павялічыўся амаль у 3,5 раза ў параўнанні з паказчыкам 2017-га. Па выніках мінулага года яго аб'ём павялічыўся яшчэ на 15 працэнтаў у параўнанні з 2022-м і склаў 620 мільёнаў долараў ЗША.

— У мінулым месяцы адбыўся візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан, які многія назвалі гістарычным. Чым абгрунтавана такая ацэнка?

— Візіт Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан 7—9 лютага і грунтоўныя перагаворы, якія прайшлі ў гэты перыяд, дэталёвае абмеркаванне шырокага спектра ўзбекска-беларускіх адносін вызначылі прыярытэты і мэтавыя задачы развіцця шматпланавага партнёрства на найбліжэйшую перспектыву. Абазначаны ключавыя кірункі супрацоўніцтва: сельская гаспадарка, лёгкая, харчовая і электратэхнічная прамысловасць, фармацэўтыка, горадабудаўніцтва, камунікацыі і іншыя.

Падрыхтоўка да візіту была каласальнай. Сустрэчы на найвышэйшым узроўні папярэднічалі пашыраныя перагаворы з удзелам профільных міністраў, кіраўнікоў рэгіёнаў і розных галін, у ходзе якіх абмеркаваны канкрэтныя далейшыя дзеянні. У прыватнасці, у рамках падрыхтоўкі да гэтага візіту паспяхова праведзены шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку чарговае пасяджэнне Міжурадавай камісіі, форумы рэгіёнаў, рэктараў, медыцынскіх работнікаў, пасяджэнне Дзелавога Савета і іншыя.

Па выніках плённых перагавораў II Форуму рэгіёнаў Узбекістана і Беларусі, які адбыўся напярэдадні, былі падпісаны кантракты і пагадненні на суму звыш мільярда долараў. Увогуле, узбекска-беларускі саміт у лютым праходзіў на такім спрыяльным фоне ва ўсіх сферах двухбаковых адносін. На перагаворах на найвышэйшым узроўні закрануты практычныя ўсе кірункі ўзаемадзеяння. Перш за ўсё, гэта далейшае прасоўванне канструктыўнага супрацоўніцтва міжпарламенцкіх сувязяў, якія пашыраюцца; працяг актыўных кантактаў паміж урадамі, міністэрствамі, ведамствамі, рэгіёнамі і дзелавымі коламі; дасягненне рэальных вынікаў у гандлёва-эканамічнай сферы; актывізацыя кантактаў і абмену ў сферы культуры і мастацтва, маладзёжнай палітыкі, адукацыі і спорту.

— Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў адзначыў, што двухбаковае супрацоўніцтва выйшла на новы ўзровень. Чым гэта характарызуецца?

— За мінулыя гады ўзбекска-беларускія шматпланавыя адносіны выйшлі на якасна новы, высокі ўзровень. Па-першае, створана насамрэч даверная і дружалюбная атмасфера ў нашых двухбаковых адносінах. Адчуваецца ўзаемная зацікаўленасць бакоў рухацца далей, паглыбляць усебаковае супрацоўніцтва. Па-другое, актыўна развіваюцца гандлёва-эканамічныя сувязі, прамысловая кааперацыя. Беларусь уваходзіць у дваццатку асноўных гандлёвых партнёраў Узбекістана па аб'ёме знешняга гандлю. Гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва — важны складнік двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі.

На сёння ў нашай краіне дзейнічаюць 209 беларускіх прадпрыемстваў, з іх 63 сумесныя і 146 са 100-працэнтным замежным капіталам. За апошнія гады колькасць прадпрыемстваў павялічылася больш як у чатыры разы. Асноўныя сферы іх дзейнасці: лёгкая прамысловасць, гандаль, машынабудаванне і металаапрацоўка, сельская гаспадарка, сфера паслуг, харчовая галіна. Акрамя таго, на тэрыторыі Беларусі дзейнічае больш за 100 прадпрыемстваў з інвестыцыямі Узбекістана.

Па-трэцяе, наладжаны непасрэдныя кантакты паміж рэгіёнамі. Па сутнасці, менавіта вобласці выступаюць драйверамі эканамічных адносін паміж краінамі. Кіраўнікі рэгіёнаў добра разумеюць адзін аднаго, яны цудоўна бачаць новыя магчымасці, перспектывы супрацоўніцтва. Па-чацвёртае, прадаўжаюцца культурна-гуманітарныя абмены, прыняты праграмы развіцця партнёрства ў галіне вышэйшай і прафесійнай адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорту і турызму.

— Беларусь і Узбекістан падпісалі дарожную карту супрацоўніцтва на 2024—2025 гады. Што мяркуецца рэалізаваць у яе рамках?

— Дарожнай картай прадугледжваецца актывізацыя гандлёва-эканамічных сувязяў, рэалізацыя сумесных праектаў прамысловай кааперацыі і гандлёвых пагадненняў, умацаванне супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Адной з асноўных мэт дакумента з'яўляецца прыняцце сумесных мер па істотным павелічэнні двухбаковага тавараабароту. А самае галоўнае — Планам мерапрыемстваў вызначаны механізмы і тэрміны рэалізацыі пастаўленых задач, а таксама канкрэтныя адказныя выканаўцы ад узбекскага і беларускага бакоў.

Акрамя далейшага пашырэння гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, у дакументе таксама замацаваны дамоўленасці аб распрацоўцы сумесных праектаў у сферы машынабудавання і электратэхнікі, харчовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, тэкстыльнай, швейнай і трыкатажнай вытворчасці, фармацэўтыкі. Замацоўваецца адкрыццё на тэрыторыі дзвюх краін гандлёвых дамоў і «шоу-румаў» з мэтай прасоўвання прадукцыі ўзбекскай і беларускай вытворчасці. Ствараецца сумесная рабочая група па прамысловай кааперацыі і гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

— Адным з прыярытэтаў у развіцці ўзаемадзеяння становіцца прамысловая кааперацыя. Якія сумесныя праекты ўжо рэалізуюцца, што ў планах?

— Важным кірункам узаемадзеяння з'яўляецца інвестыцыйнае супрацоўніцтва і развіццё кааперацыйных сувязяў паміж нашымі таваравытворцамі. Сёння ўжо рэалізуюцца сумесныя праекты на тэрыторыі Узбекістана ў галіне фармацэўтыкі. Беларускія кампаніі сумесна з узбекскімі партнёрамі плануюць пабудаваць ва Узбекістане птушкафабрыку і малакаперапрацоўчы завод. Асаблівая цікавасць беларускага боку — да тэкстыльнай прамысловасці Узбекістана, адной з драйверных галін айчыннай эканомікі. Як нацыянальны брэнд, гэтая сфера заняла дастойнае месца на сусветным рынку. У нашай краіне з удзелам беларускіх інвестыцый паспяхова функцыянуе прадпрыемства па выпуску гатовага адзення пад брэндам Mark Formelle. Беларуская буякі паспяхова прайшлі тэсціраванне ва ўмовах Узбекістана.

У галіне экспарту ІТ-паслуг ёсць вялікі нерэалізаваны патэнцыял, які можна развіваць паміж узбекскім ІТ-паркам і беларускім Паркам высокіх тэхналогій. Можна з упэўненасцю сказаць, што рэжым бяспошліннага гандлю, а таксама наяўнасць узаемадапаўняльных сфер эканомікі ствараюць спрыяльныя ўмовы для пашырэння паміж нашымі краінамі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і кааперацыйнага ўзаемадзеяння ў многіх сферах эканомікі.

— Якія меры плануецца прыняць, каб дасягнуць тавараабароту звыш мільярда долараў?

— Я ўжо казаў аб паспяховым правядзенні II Форуму рэгіёнаў і пасяджэнні Дзелавога савета напярэдадні афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан. У гэтых мерапрыемствах прынялі ўдзел звыш 350 прадстаўнікоў бізнесу і рэгіёнаў. Па выніках былі дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці, падпісана больш за 100 дакументаў, сярод якіх інвестыцыйныя пагадненні, экспартныя і імпартныя кантракты. А дагэтуль у пачатку лютага па лініі гандлёва-прамысловых палат дзвюх краін Беларусь наведала вялікая бізнес-дэлегацыя Узбекістана ў складзе каля 100 прадпрымальнікаў. Паміж дзелавымі коламі падпісаны шматмільённыя кантракты.

Яшчэ адзін важны напрамак, які набірае абароты, — электронны біржавы гандаль. Па выніках 2023 года сума здзелак узбекскіх удзельнікаў таргоў на Беларускай універсальнай таварнай біржы вырасла ў 17 разоў, а колькасць акрэдытаваных кампаній з Узбекістана павялічылася да 97, што ўдвая больш, чым у 2022 годзе.

Асобная тэма — супрацоўніцтва па асваенні рынкаў Паўднёвай Азіі. Падчас новай рэгіянальнай палітыкі Узбекістан узяў курс на актывізацыю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі, што стварае магчымасць выхаду сумеснай узбекска-беларускай прадукцыі на рынкі трэціх краін, у тым ліку Афганістана.

— Як развіваецца супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, у прыватнасці ў галіне аховы здароўя, адукацыі, навукі, культуры, турызму?

— Падмуркам для развіцця культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва з Беларуссю з'яўляюцца дружалюбныя сувязі народаў дзвюх краін. Сёння ва Узбекістане пражываюць каля 19 тысяч беларусаў, якія ўносяць свой уклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё краіны. Жывучы ў міры і згодзе ў шматнацыянальным і талерантным Узбекістане, яны захоўваюць і прасоўваюць сваю культуру і традыцыі. Сімваламі сяброўства двух народаў сталі ўсталяваныя помнікі беларускаму пісьменніку Якубу Коласу ў Ташкенце і вялікаму ўзбекскаму паэту і мысліцелю Алішэру Наваі ў Мінску. Пашыраецца супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі. Штогод у Беларусі арганізоўваюцца Дні ўзбекскага кіно, а ва Узбекістане — Дні беларускага кіно. У 2021 годзе фільм «Ілхак» узбекскага рэжысёра Джахангіра Ахмедава атрымаў Гран-пры Мінскага кінафестывалю «Золата Лістапада», а таксама спецыяльны прыз «За гуманізм і духоўнасць у кіно» ад імя Прэзідэнта Беларусі.

У сферы адукацыі з Беларуссю падпісана каля 180 міжвузаўскіх пагадненняў і мемарандумаў аб супрацоўніцтве. Цеснае ўзаемадзеянне наладжана паміж Ташкентам і Мінскам у галіне аховы здароўя. На базе пагаднення паміж міністэрствамі аховы здароўя дзвюх краін рэалізоўваецца План мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва. Узбекістан і Беларусь маюць унікальныя магчымасці і патэнцыял для ўзаемадзеяння ў турыстычнай сферы.

— Як ажыццяўляецца ўзаемадзеянне нашых краін на міжнароднай арэне — у ААН, СНД, ШАС і іншых глабальных і рэгіянальных структурах?

— Узбекістан і Беларусь аказваюць узаемную падтрымку на міжнароднай арэне, эфектыўна ўзаемадзейнічаюць на міжрэгіянальных і шматбаковых пляцоўках, у тым ліку ў рамках ААН, СНД, ШАС, Руху недалучэння. Узбекістан падтрымлівае паўнапраўнае членства Беларусі ў ШАС. У гэтым пытанні назіраецца істотнае прасоўванне пасля запуску працэдуры прыёму на Самаркандскім саміце 2022 года. У сваю чаргу спадзяёмся на цесную работу ў перыяд старшынства Узбекістана ў Руху недалучэння ў 2027—2029 гадах.

Сёння ёсць усе перадумовы, каб узмацніць работу ў самых розных кірунках. Для гэтага існуе і палітычная воля, і ўзаемная цікавасць, і вялікія рэзервы для нарошчвання двухбаковых сувязяў. Адным словам, узбекска-беларускія адносіны з кожным днём напаўняюцца новым зместам, і афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан дазволіў вызначыць новыя гарызонты супрацоўніцтва і ўмацаваць сяброўскія адносіны паміж народамі дзвюх краін.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Поўны тэкст — на партале zviazda.by

ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА»
филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
по поручению Гомельской дистанции электроснабжения
РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги» (продавец)
извещает о проведении 10 апреля 2024 года
открытого повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества в 11.00
в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

№ лота	Наименование лотов	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %)	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %)
1	Капитальное строение с инв. № 320/С-27871, общей площадью 45,1 кв. м, наименование – здание мастерской. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Пиревичский с/с, 6, здание мастерской вблизи станции Салтановка. Коэффициент спроса – 0. Базовая ставка – 0. Коэффициент месторасположения – 0	**29,70**	**29,70**

Сведения о продавце	Гомельская дистанция электроснабжения РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги», 246031, г. Гомель, ул. 50 лет Гомсельмаша, 35
Срок подачи заявления	**С 28.03.2024 г. по 08.04.2024 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY70BPSB30121112410199330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, УНП 400057597, получатель – Гомельская дистанция электроснабжения РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги», назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код платежа 40901 «Перечисление гарантийного взноса»
Условия пользования	Для организации розничной торговли, размещения офиса, оказания услуг (в том числе автосервиса), для использования под складские помещения
Размер штрафа	Лот № 1 – 0,5 (ноль целых пять десятых) базовой величины, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству)

Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 5 (пять) %. Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора аренды осуществляется по контактному тел.: 802334-62-214, 8 (029) 38-58-490 – Старостенко Дмитрий Петрович (по осмотру), 80232-50-89-51 8 (029) 30-48-480 Воробьёв Роман Александрович (по заключению договора аренды).

В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 07.12.2023 г. № 237 (30117).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже земельных участков
гражданам Республики Беларусь в частную собственность

Организатор электронных торгов: Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Речная, 14, тел.: (801713) 63935, 31636, 8 (029) 2424313).
Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by.
Дата проведения электронных торгов: **29 апреля 2024 года.**
Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Беларусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

Адрес земельного участка	Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура (возможность подключения)	Начальная цена (рублей)	Задаток, руб.	Расходы по подготовке документации (рублей)
Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Минская, уч. 149А	624483402101001707; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	0,1346	Сети электро-снабжения	17 000,00	1700	2058,16+ стоимость объявления в СМИ и ЭТП
Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дричин, ул. Парковая, уч. 10	624483402001000323; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	0,15	Сети электро-снабжения, газо-снабжения	7000,00	700,00	1638,03+ стоимость объявления в СМИ и ЭТП

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) № BY60AKBB3 01200000669400000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в электронных торгах.

Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах.

Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами по 24 апреля 2024 года до 15.00.

Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник – пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, том числе земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

УНП 600177864

Отчет эмитента ценных бумаг за 2023 год
ООО «Темпл Сити»

220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, УНП 192280260.
Вид экономической деятельности: сдача внаем собственного и арендуемого имущества.
Единица измерения: тыс. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2023 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2023 года	На 31 декабря 2022 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	10 746	9 993
Нематериальные активы	120	-	1
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	14	14
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	9	9
ИТОГО по разделу I	**190**	**10 769**	**10 017**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	14	14
в том числе:			
материалы	211	14	14
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	-	-
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	131	142
Краткосрочные финансовые вложения	260	22	19
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	154	80
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ II	**290**	**321**	**255**
БАЛАНС	**300**	**11 090**	**10 272**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2023 года	На 31 декабря 2022 года
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	1 874	1 874
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	3 840	2 903
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	(1 100)	(42)
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**4 614**	**4 735**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	5 308	3 906
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	334	334
ИТОГО по разделу IV	**590**	**5 642**	**4 240**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	629
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	731	575
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	103	93
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	39	36
по авансам полученным	632	6	8
по налогам и сборам	633	18	13
по социальному страхованию и обеспечению	634	-	-
по оплате труда	635	1	1
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	39	35
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**834**	**1 297**
БАЛАНС	**700**	**11 090**	**10 272**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь – декабрь 2023 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2023 года	За январь–декабрь 2022 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	886	925
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	-	-
Валовая прибыль	030	886	925
Управленческие расходы	040	(540)	(468)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	346	457
Прочие доходы по текущей деятельности	070	515	361
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(537)	(377)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	324	441
Доходы по инвестиционной деятельности	100	-	1
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	-	1
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	412	1 765
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	412	1 765
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(1 790)	(2 114)
в том числе:			
проценты к уплате	131	(329)	(298)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(1 454)	(1 809)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(7)	(7)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	(1 378)	(348)
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	(1 054)	93
Налог на прибыль	160	-	-
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток)	210	(1 054)	93
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	937	2 903
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	(117)	2 996
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
28 САКАВІКА 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15974)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Вольга ЗДЗЯРСКАЯ:

«ДЛЯ МЯНЕ МАЯ ПРАФЕСІЯ — ЖЫЦЦЁ»

Штогод 27 сакавіка адзначаецца Сусветны дзень тэатра. Гэта свята ўсіх, хто служыць тэатральнаму мастацтву, а таксама тых, хто з'яўляецца яго прыхільнікам. Апошнія, мяркуем, ведаюць, што нядаўна ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага адбылася прэм'ера спектакля «Анфіса» па п'есе Леаніда Андрэева, у якім адну з галоўных роляў выконвае актрыса Вольга Здзярская. Увогуле, за яе плячыма нямала роляў, і ў кожнай артыстка пазнавальная па-свойму: капрызная Аглая ў спектаклі «Ідыёт», Наталля Пятроўна ў летняй цёплай пастаноўцы «Месяц у вёсцы», Жэнеўева ў «Як стаць багатым» і шмат іншых. Ураджэнка Ашмян захапляецца беларускай культурай з дзяцінства, але ў тэатры апынулася па волі лёсу. Мы пагутарылі з Вольгай пра яе шлях да сцэны, натхненне і даведаліся, які адбітак накладвае акцёрская прафесія на звычайнае жыццё.

— Вольга, раскажыце, што абудзіла ў вас інтарэс да мастацтва?

— Абодва мае дзядулі былі таленавітымі музыкамі. Адзін з іх кіраваў тэатрам і хорам пры сельскім Доме культуры ў вёсцы Пескаўцы Лідскага раёна. Ён любіў ставіць спектаклі па п'есах знакамітых беларускіх драматургаў. Другі — цудоўна іграў на баяне. Я заўсёды слухала іх з замірaннем сэрца. Некаторыя моманты майго дзяцінства і цяпер выклікаюць у мяне слёзы шчасця...

— Падзяліцеся, калі ласка...

— Калі наша вялікая сям'я прыязджала на выхадныя ў вёску да бабулі з дзядулем, а нас заўсёды было шмат, то за вячэрай дзядуля часта запяваў якую-небудзь беларускую песню. І ўся сям'я падхоплівала, мы спявалі ўсе разам. Мне тое вельмі падабалася, бо ў такія летнія вечары неяк асабліва адчуваліся любоў і цяпло, якія ядналі нас. Гэтыя ўспаміны і для мяне дарослай па-ранейшаму самыя дарагія.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Час маладых

Ініцыятыва знаходзіць водгук

Днямі ў Мінску прадставілі 26 праектаў, якія перамаглі сёлета ў рэспубліканскім конкурсе маладзёжных ініцыятыў. Іх аўтарам уручылі ганаровыя пасведчанні на атрыманне сродкаў для фінансавання і рэалізацыі сваіх ідэй.

Конкурс маладзёжных ініцыятыў ужо другі год афіцыйна выдзяляе фінансавую падтрымку ад дзяржавы. Па пастанове Савета Міністраў № 87 ад 31 студзеня 2023 года «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку фарміравання, фінансавання і рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў», арганізатарам конкурсу ў 2024 годзе стала Міністэрства адукацыі, а правядзенне і каардынацыю ажыццяўляе Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

«На тое, каб ініцыятывы моладзі былі падтрыманы, выдаткоўваюцца даволі вялікія сродкі, і штогод фінансаванне расце. Так, у гэтым годзе агульная сума грантаў складае 800 тысяч рублёў. Вядома, мы імкнёмся падтрымаць як мага больш праектаў, якія маюць практычны выхад. І вельмі прыемна, што некаторыя пераможцы мінулых двух сезонаў зноў падаюць заяўкі, каб развіць альбо пашырыць свае праекты», — падкрэсліла **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ.**

Расказалі пра свае ідэі і 26 пераможцаў новага сезона. Многія з праектаў накіраваны на развіццё творчага і інтэлектуальнага патэнцыялу моладзі, папулярызацыю спорту і здаровага ладу жыцця. Заслугоўваюць увагі праекты па інклюзіўным развіцці, захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, ініцыятывы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў і пошуку заблукалых і зніклых без вестак.

Заявіць пра сябе ў індустрыі медыя

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны з 2024 года плануе адкрыць набор па спецыяльнасці «Журналістыка». Як паведаміла БелТА са спасылкай на старшыню камітэта ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніса ЯЗЕРСКАГА, на мэтавую падрыхтоўку ўжо паступіла 12 заявак.

На яго думку, магчымасць атрымання профільнай адукацыі непасрэдна ў рэгіёне можа стаць адным з рашэнняў у тэме забеспячэння рэдакцый вобласці маладымі кадрамі: «Камітэтам ініцыіравана адкрыццё ў 2024 годзе спецыяльнасці «Журналістыка» ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны. Гэта дазволіць забяспечыць падрыхтоўку кадраў для рэдакцый, у тым ліку і электронных СМІ».

Таксама прадстаўнік камітэта адзначыў, што і на месцах праводзіцца вялікая прафарыентацыйная работа і на базе рэдакцый рэгіянальных СМІ працуе 21 клуб юнага журналіста. У іх у рэдакцыйнай рабоце ўдзельнічае больш за 160 чалавек, якія праводзяць інтэрв'ю, бліц-апытанні, стрымы.

Магчыма менавіта для іх і для ўсіх, хто мае жаданне рэалізаваць сябе ў журналістыцы, з'яўленне новай спецыяльнасці дазволіць зрабіць крок у прафесію. Пры паступленні прэтэндэнтам прапануюць напісаць эсэ на зададзеную тэму, прайсці сумоўе. Будуць улічвацца вынікі двух цэнтралізаваных экзаменаў.

У кітайскай моладзі папулярныя антыстрэсавыя тавары

Паводле апублікаванай «Справаздачы аб трэндах спажывання ў Кітаі за 2023 год», маладыя людзі гатовы выдаткоўваць усё больш грошай на тавары і паслугі, якія дастаўляюць ім радасць і пазбаўляюць ад стрэсу, што прывяло да павелічэння прапановы ў гэтай сферы, перадае «Жэньмінь жыбаа» анлайн».

У справаздачы адзначаецца, што маладыя людзі купляюць вячэрнія навучальныя курсы, якія дапамагаюць зарадзіцца пазітыўнай энергіяй, носяць яркае адзенне для ўзняцця настрою, купляюць спінеры, кубікі Рубіка, «вадкія» мішак.

Сярод папулярных тавараў — бранзалеты-чоткі. Колькасць пакупак бранзалетаў з сандалавага дрэва, золата, а таксама будыйскіх бранзалетаў павялічылася на 280, 115 і 87 працэнтаў адпаведна ў гадавым вылічэнні ў дзень распродажаў «11.11» на JD.com.

«Хованкі» — гульня, адноўленая з дапамогай тэхналогіі «Інтэрнэт+», стала новым трэндам. Для гульні не патрэбна спецыяльная экіпіроўка або веды, што зрабіла яе папулярнай для баўлення вольнага часу сярод моладзі пасля работы ці вучобы.

«Дафамінавы стыль адзення» — яшчэ адзін трэнд, які азначае стварэнне радаснага настрою з дапамогай яркіх і рознакаляровых камбінацый адзення. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што высокая насычанасць фарбаў стварае пачуццё радасці. «Дафамінавая» колеравая гама таксама стала рухавіком у спажыванні касметыкі, наведванні рэстаранаў і набыцця калекцыйных фігурак.

Фотарэпартаж

ЭМОЦЫІ І АДКРЫЦЦІ ГРАНД-ФІНАЛУ

Чым здзіўляў праект «100 ідэй для Беларусі»

У Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку днямі прайшоў гранд-фінал 13-га сезона рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі». Вялікая экспазіцыя са 171 аўтарскім праектам, яркія эмоцыі і атмасфера свята навукі і творчасці чакалі ў гэты дзень наведвальнікаў.

— Праект «100 ідэй для Беларусі» — ужо візітная картка Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Ён рэалізоўваецца сумесна з Міністэрствам адукацыі, Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях і Нацыянальнай акадэміяй навук, — адзначыла **кіраўнік праекта, афіцыйны прадстаўнік ЦК БРСМ Кацярына ЛАКІСАВА.** — Сёлета мы завяршаем 13-ы сезон, а за гэтыя гады больш за 3,5 тыс. праектаў былі рэалізаваны і ўкаранёны ў рэальны сектар эканомікі нашай краіны. Гэта вялікая лічба, якой мы ганарымся. За кожным праектам стаіць ідэя маладога чалавека, які не пабаяўся прэзентаваць сваю працу, быў заўважаны і, галоўнае, давёў справу да канца і прынёс карысць роднай Беларусі.

Сёлета таксама вызначаць 30 пераможцаў у 10 намінацыях і трох узроставых катэгорыях. Аддаць голас за ўпадабаны праект і падтрымаць яго аўтара можна ў тэлеграм-канале «БРСМ: live» і ў афіцыйнай групе праекта «100 ідэй для Беларусі» ў «ВКонтакте». Вынікі аб'явяць 4 красавіка.

— Гэта навацыя, бо раней у нас былі дзве ўзроставыя катэгорыі. У гэтым годзе мы ацэньваем асобна навучэнцаў школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, студэнтаў і курсантаў, а таксама працоўную моладзь і маладых вучоных. Такім чынам, дабіліся максімальна вялікай колькасці пераможцаў за ўсю гісторыю праекта, — растлумачыла Кацярына Лакісава. — Ацэньваем у 10 намінацыях, якія адпавядаюць асноўным прыярытэтным кірункам навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў Беларусі. Ёсць і дзве спецыяльныя намінацыі: «Найлепшая бізнес-ідэя» і «Грамадства і сацыяльная сфера».

Яшчэ ў гэтым годзе павялічылася колькасць крытэрыяў ацэнкі праекта ў адпаведнасці з запытамі міністэрстваў, ведамстваў, арганізацый і прадпрыемстваў на канкрэтныя інавацыйныя распрацоўкі. Па выніках конкурсу пераможцы, акрамя падарункаў ад партнёраў праекта, змогуць прэтэндаваць на ўключэнне ў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Тэхнагід ад Прохара ЛУСЦЯНКОВА.

Вось такі ўнікальны заплечнік можа атрымацца з саломы, торфу і напаўраскладзеных раслінных рэшткаў пасля кампаставання.



Цягавы пратэз з ужываннем пнеўматычных сістэм распрацавала Ксенія БЕЛІКАВА.

Дзякуючы рэцыркуляцыі вады ў санвузле энергазберажэнне выйдзе на новы ўзровень.

Кірыл АЛЬХОВІК дэманструе канструкцыю рагатых вулляў Паліводы.

Цяпер знойдзена экалагічная біярасладальная альтэрнатыва штучным кветкам.

Гэтыя незвычайныя ўпрыгажэнні зроблены з перапрацаваных пластыкавых закрутак.

Вольга ЗДЗЯРСКАЯ:

«ДЛЯ МЯНЕ МАЯ ПРАФЕСІЯ — ЖЫЦЦЁ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А чаму тады не сталі спявачкай?

— Я з дзяцінства казала маме, што хачу быць артысткай. Бацькі смяяліся, вядома, але заўсёды мяне падтрымлівалі. Таму пасля заканчэння школы паступіла ў Лідскі дзяржаўны музычны каледж на спецыяльнасць «Музыказнаўства». Далей планавала паступіць на падрыхтоўчыя курсы ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, але не склалася. Перад уступнымі іспытамі даведалася, што патрэбна мець даведку ад фаніятра. Тэрмінова звярнулася да ўрача, які нечакана выявіў у мяне нязначныя праблемы са звязкамі. Неабходны для паступлення дакумент я не атрымала, і ўсе планы сарваліся...

Думаю, так склалася невыпадкова. На той час у мяне заставалася не так шмат варыянтаў для паступлення, аднак была магчымасць падаць дакументы ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Хоць я адчувала, што слаба падрыхтаваная да ўнутраных іспытаў, але ў прыёмнай камісіі мне прапанавалі падаць дакументы на спецыяльнасць «Рэжысура тэатра» («Музычны тэатр») на курс заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі Міхаіла Кавальчыка. Я пагадзілася, паспяхова здала экзамены і паступіла.

— Чым запомніліся гады вучобы?

— Мне вельмі пашанцавала, таму што побач са мной былі майстры сваёй справы, цудоўныя шчырыя людзі. Яны вучылі нас, студэнтаў, быць рознымі: эмацыянальнымі, крыху разняволенымі, адкрытымі і прагнымі да ведаў, да жыцця. Можна сказаць, за пяць гадоў я адкрыла для сябе цэлы свет — тэатральны. І ўжо не ўяўляю без яго свайго жыцця.

— Вядома, што вы пачалі працаваць у НАДТ імя М. Горкага на трэцім курсе. Раскажыце пра гэты вопыт...

— На трэцім курсе мы рыхтаваліся да ўдзелу ў міжнародным конкурсе, які праходзіў у Тэатральным інстытуце імя Барыса Шчукіна. Ставілі сцэнку на адну тэму — па матывах «Казкі пра рыбака і рыбку» Аляксандра Пушкіна. Рэжысёр НАДТ імя М. Горкага Валянціна Еранькова аднойчы прыйшла да нас на рэпетыцыйны паказ. Ёй спадабалася, напэўна, як я іграла, таму мне прапанавалі супрацоўніцтва.

Я вельмі ўдзячная рэжысёру тэатра, заслужанаму дзеячу мастацтва Рэспублікі Беларусь Валянціне Рыгораўне Ераньковай і мастацкаму кіраўніку тэатра, заслужанаму дзеячу мастацтва Рэспублікі Беларусь Сяргею Міхайлавічу Кавальчыку за тое, што далі мне магчымасць яшчэ студэнткай працаваць у тэатры. Памятаю, як увесь час бегала з тэатра ў Акадэмію і наадварот, бо мне хацелася ўсё паспяваць. Скажу шчыра, да тэатра ніколі не заўважала за сабой такой стараннасці і шчырага жадання нешта рабіць.

— Па размеркаванні вы трапілі ў Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр, але пасля адпрацоўкі вярнуліся ў тэатр імя М. Горкага. Чаму?

— Я ніколі не лічыла сябе супервакалісткай, аднак і ў Музычным тэатры, дзе працуюць артысты з вельмі моцнымі галасамі, як мне здаецца, знайшла сваё месца. Іграла вельмі цікавыя ролі: Ізольду ў спектаклі «Трыстан і Ізольда» і Забаву ў «Лятучым караблі». Гэта былі два гады цудоўнай працы. Пасля мне прапанавалі вярнуцца ў НАДТ імя М. Горкага, і я пагадзілася. Чаму? Вельмі люблю слухаць музыку, працаваць з ёй, але драматычны тэатр мне ўсё ж такі бліжэй.

— Раскажыце, ці накладвае адбітак акцёрская прафесія на звычайнае жыццё?

— Мая прафесія для мяне — жыццё. І з-за гэтага мне бывае складана кіраваць часам. Калі знаходзіцца свабодная ад працы хвілінка, я чэрпаю натхненне, каб назаўтра зноў прыйсці ў тэатр напоўненай жыццёвай энергіяй, добра сыграць у спектаклі і — самае галоўнае — выклікаць эмоцыі ў гледача. Бясспрэчна, трэба шукаць нейкі баланс, каб хапала часу і паклапаціцца аб сваім здароўі, і схадзіць на ёгу або правесці час з блізкімі і не перагарэць.

— А чым вы натхняецеся?

— Талентам, людзьмі, звычайнымі рэчамі. Напрыклад, калі п'ю смачную каву з любімага кубка або чытаю цікавую кнігу. Бывае, гляджу спектаклі або кіно і атрымліваю неверагодную асалоду ад прыгажосці чалавека. Нават магу загледзецца на кагосьці, калі мяне нечым прывабяць яго вочы, рукі, валасы. Мне здаецца, прыгажосць ёсць у кожным з нас, толькі трэба яе разгледзець.

— Як уплывае на вас праца ў тэатры?

— Гэта цікава. Ведаеце, нельга сказаць, што студэнткай я была вельмі загнанай і сціплай, але тэатр насамрэч дазволіў мне адкрыць саму сябе з іншага боку, пазбавіў ад многіх комплексаў.

— А як вы ставіцеся да крытыкі?

— Крытыка дае магчымасць стаць найлепшым, калі заўвагі канструктыўныя і справядлівыя. Міхаіл Кавальчык, майстар нашага курса, аднойчы наконт гэтага сказаў такую рэч, якая мне вельмі адклікаецца: «У любым выступленні можна ўбачыць добрае і дрэннае. І калі вы вырашылі напісаць водгук аб спектаклі, кнізе ці фільме, трэба заўсёды пачынаць з пазітыўнага: што вас здзівіла, натхніла, ураза. А потым крытыкаваць».

Глядач мае суб'ектыўнае меркаванне. Зразумела, спектакль раскрывае адну тэму для ўсіх, аднак чалавек усё роўна адчувае сэнс па-рознаму, таму што жыццёвы вопыт у кожнага свой. Харастwo тэатральнага мастацтва якраз у тым, што яно суб'ектыўнае.

— Як вы рыхтуецеся да спектакляў?

— У мяне выпрацаваны пэўны парадак, якога прытрымліваюся падчас падрыхтоўкі. Абавязковы этап — артыкуляцыйная і дыхальная гімнастыка. Яшчэ, бывае, каб прывесці сябе ў тонус, скачу на скакалцы або гуляю пешшу вакол тэатра, слухаючы музыку. Часам расцягваюся, каб разагрэць звязкі. Самы адказны момант для мяне наступае за дзесяць хвілін да пачатку спектакля, калі мне важна сабрацца з думкамі, каб выступіць на «выдатна».

— Раскажыце, калі ласка, пра сваю гераіню ў прэм'ерным спектаклі па п'есе Леаніда Андрэева «Анфіса».

— Сваю Анфісу я ўжо вельмі палюбіла. Гэтая гераіня асацыіруецца ў мяне з акіянам — яна такая ж глыбокая, неаднастайная, розная. Думаю, я буду яшчэ доўга разбірацца ў гэтым персанажы. ...Каханне было для яе адзінай магчымасцю зачапіцца за жыццё, таму што мая гераіня па п'есе страціла дзіця, а гэта, як вы разумееце, самае страшнае, што толькі можа здарыцца з жанчынай-маці.

Не толькі ў Анфісы, але і ў іншых герояў пастаноўкі вельмі складаныя лёсы. У іх супярэчлівыя псіхалагічныя партрэты, але яны пазнавальныя для кожнага з нас. Ужо з першай сцэны мы бачым, што ў сям'і, дзе адбываецца дзеянне, бяда. Спектакль атрымаўся складаны, філасофскі, глыбокі. Яму ўласцівы і псіхалагізм, і сімвалізм, таму што Леанід Андрэеў прызнаны яркім пісьменнікам Сярэбранага веку рускай літаратуры. Гэтая пастаноўка — з ідэямі містыкі, фатуму, рока. І яны адчуваюцца падчас прагляду, пастаянна трымаюць гледача ў тонусе. Наша гісторыя — незвычайны любоўны чатырохкутнік з адным «але» — там няма любові. Вельмі раю паглядзець яе кожнаму.

— А што для вас значыць любоў?

— Гэта нешта вельмі патрэбнае, тое, без чаго немагчыма ўявіць чалавечае жыццё. І калі любоў да блізкага будзе ў кожнага з нас на першым месцы, то мы ўсё зможам.

Яна ВАЛАСАЧ.
Фота з архіва гераіні.

Абітурыенту

Спецыяльнасць па душы і з перспектывай

Кожны старшакласнік аднойчы задумваецца пра тое, куды паступаць пасля школы. Разнастайнасць універсітэтаў і каледжаў у нашай краіне, вядома, ускладняе дадзенае пытанне. І каб дапамагчы абітурыентам адшукаць сваё, у сценах навучальных устаноў нярэдка праводзяць прафесійна-арыентацыйныя мерапрыемствы.

Упершыню ў Беларусі 23 сакавіка адбыўся адзіны дзень адчыненых дзвярэй. Такое мерапрыемства сёлета правялі ў рамках агульнарэспубліканскай акцыі «Я выбіраю прафесію». Адметнасць яе ў тым, што на сустрэчу з патэнцыяльнымі студэнтамі былі запрошаны прадстаўнікі шэрагу арганізацый — заказчыкаў кадраў.

Напярэдадні ўсе ВНУ і каледжы нашай краіны запрашалі да сябе ў госці абітурыентаў, якія жадаюць атрымаць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў таксама не застаўся ўбаку. Штогод у гэтую навучальную ўстанову паступаюць некалькі соцень чалавек. І на адзіным дні адчыненых дзвярэй прэтэндэнтаў на званне студэнта дадзенага ўніверсітэта было нямала, як і пытанняў. Фармат мерапрыемства дазваляў старшакласнікам і іх бацькам наўпрост спытаць у прадстаўнікоў універсітэта пра ўсё, што цікавіць. Пыталіся пераважна пра тое, як адбываецца навучанне ў студэнтаў аддзялення завочнай формы, якая колькасць месцаў на тую ці іншую спецыяльнасць, якія прадметы неабходна здаваць на цэнтралізаваным тэсціраванні.

У склад комплексу БДУКМ уваходзіць усяго чатыры факультэты, але, нягледзячы на гэта, навучальная ўстанова можа пахваліцца багаццем спецыяльнасцяў. Самая папулярная з іх — «Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі». Тут рыхтуюць будучых спецыялістаў па кіраванні і камунікацыях, якія змогуць пасля працаваць у галіне кіравання арт-аб'ектамі, у цэнтрах вольнага часу і культурнай спадчыны.

Універсітэт размяшчаецца ў чатырох карпусах. Усе заняткі праходзяць у аўдыторыях, аснашчаных інтэрактыўнай і мультымедыйнай тэхнікай, сучасным вучэбна-лабараторным абсталяваннем. Тут ёсць таксама лінгафонныя кабінеты — спецыяльныя памяшканні, у якіх усталёўваецца праекцыйнае і гукатэхнічнае абсталяванне.

— Для практычных заняткаў у студэнтаў творчых спецыяльнасцяў тут створаны ўсе неабходныя ўмовы. У вучэбнай праграме задзейнічаны індывідуальныя і аркестравыя класы, абсталяваныя музычнымі інструментамі, а яшчэ ёсць спецыялізаваныя харэаграфічныя і тэатральныя пляцоўкі, — адзначыла **начальнік аддзела па прафарыентацыйнай рабоце і рэкламе БДУКМ Аліна СТЭЛЬМАКОВА.**

Пражыванне студэнтаў сканцэнтравана ў трох студэнцкіх інтэрнатах, два з якіх знаходзяцца непасрэдна на тэрыторыі ўніверсітэта, што вельмі зручна. Засяляюць студэнтаў у блокі з двухмеснымі нумарамі. Адметна тое, што адміністрацыя БДУКМ гарантуе забеспячэнне жыллём усіх іншагародніх студэнтаў першага курса. Акрамя таго, навучальная ўстанова мае свой спартыўна-культурны цэнтр з дзвюма трэнажорнымі і спартыўнымі заламі.

На дні адчыненых дзвярэй немалую частку часу прысвяцілі тэме падрыхтоўкі спецыялістаў па мэтавым накіраванні. Заказчыкі кадраў распавялі падрабязней аб пасадах і перавагах, якія чакаюць выпускнікоў. Прадстаўнікі арганізацый запэўнілі школьнікаў, што адпрацоўка будзе праходзіць у межах Мінска з добрымі ўмовамі. Па іх словах, пяць гадоў, а столькі сёння доўжыцца адпрацоўка мэтавіка, будуць насычаны разнастайнай і цікавай працай.

Завяршылася мерапрыемства паказам пастаноўкі «Хай будзе святло!», якую для гасцей універсітэта падрыхтавалі студэнты кафедры тэатральнай творчасці. Вершы Барыса Пастарнака, танцавальныя і музычныя нумары, гульня са святлатэхнікай — усім гэтым можна было цешыцца на працягу гадзіны і прасякацца любоўю да тэатра...

Яўгеній КСЯНДЗОЎ,
фота аўтара.

На заметку

Кніга знойдзецца для кожнага

XXXI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш прайшла ў сталіцы ў сярэдзіне сакавіка. На галоўным святе амаратараў кніг былі прадстаўлены як нацыянальныя, так і міжнародныя дасягненні ў сферы літаратуры і кніжнай справы. Мерапрыемствы ладзілі ўстановы адукацыі, буйныя беларускія і вузкаспецыялізаваныя выдавецтвы, а таксама бібліятэкі сталіцы. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведаў некаторыя стэнды, падзяліўся ўражаннямі і склаў уласны спіс рэкамендацый.

МЫ ВЕДАЕМ, МЫ ГАНАРЫМСЯ

Цэнтральнай падзеяй выстаўкі сталі мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У першы дзень прэзентавалі дакументальнае выданне «За цябе, Беларусь!». У ім распавядаецца пра лёс і вызваленне нашай краіны падчас Вялікай Айчыннай вайны. Кнігу можна назваць «дзённікам вызвалення», бо ў ёй паказаны кожны дзень вайны, пачынаючы з 22 чэрвеня і заканчваючы днём вызвалення Мінска. А дзякуючы Музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны кожны дзень баёў праілюстраваны рэдкімі фатаграфіямі і архіўнымі матэрыяламі, картамі баявых дзеянняў.

— Кніга хоць невялікая па фармаце, але вельмі змястоўная, — адзначыў намеснік дырэктара «Мастацкай літаратуры» Віктар Шніп. — Гэта падручнік гісторыі і мужнасці беларускага народа, усіх, хто змагаўся з акупантамі. Немцаў білі ў самыя першыя дні, і адпор захопнікам быў моцны. Няма ніводнага месца ў Беларусі, дзе б не адбываліся гэтыя падзеі...

Выданне раскажа чытачу і пра пачатак партызанскай вайны, і пра дзень выхаду першага падпольнага нумара газеты «Звязда», і пра знакаміты подзвіг экіпажа Маслава, а таксама пра многія іншыя знакавыя падзеі падчас вызвалення Беларусі, у якім прымала гераічны ўдзел і моладзь. Гэта подзвіг Марата Казея, Зоі Касмадзям'янскай і іншых падпольшчыкаў. Таксама да выдання выйдзе дадатак успамінаў ветэранаў «Ніколі не забудзем», які з 1948 года зведаў 20 перавыданняў...

Звярнула на сябе ўвагу і кніга «Выбары ў Беларусі. Коратка пра галоўнае», падрыхтаваная выдавецтвам «Беларусь» сумесна з ЦВК. Па словах аўтараў, распавесці чытачу пра выбарчы працэс простай мовай было складанай задачай, бо выбары — гэта закон, а кніга — творчасць. Аднак у прадстаўленым выданні выбарчы працэс і яго гісторыя пададзены зразумела і цікава для розных пластоў насельніцтва, нават з выкарыстаннем шрыфту Брайля і мультымедыйных QR-кодаў.

НА СКРЫЖАВАННІ ПРЫРОДЫ І НАВУКІ

Значную частку выставачнага павільёна займалі стэнды ўніверсітэтаў Беларусі і адукацыйныя праекты. Напрыклад, БДУ быў прадстаўлены Фундаментальнай бібліятэкай універсітэта. Найперш звярнулі на сябе ўвагу серыя кніг пра гісторыю навучальнай установы «Памяць і Слава», а таксама трылогія «Каштоўны свет сучаснага чалавека», якая распавядае пра трансфармацыю каштоўнасцяў беларусаў і еўрапейцаў. Прыемна было ўбачыць тут і альманах студэнцкай прозы і паэзіі «аБДУмана», у якім прадстаўлены вершы студэнтаў, іх разважанні пра пісьменнікаў і навукоўцаў мінулага.

А Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк прадставіў архітэктурныя праекты сваіх выхаванцаў — павільён «Белдрук» і выставачны павільён «Стужка». Тэхнапарк запрацаваў у пачатку 2021 года, і сёння ён прапануе 15 прыкладных напрамкаў для навучэнцаў 9—11 класаў, такіх як фізіка, хімія, робататэхніка і іншыя навукі. Абараніўшы выніковы праект, можна працягваць вывучэнне выбранага прадмета дыстанцыйна. Таксама тэхнапарк дазваляе паступіць у прафільную ВНУ экстэрнам, атрымаўшы рэкамендацыйны ліст ад назіральнага савета ўстановы.

Аб роднай прыродзе і адпачынку з раўеснікамі расказаў праект Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства «Маладзёжны турызм у Рэспубліцы Беларусь». Праект функцыянуе як сістэма дадатковай адукацыі. Створаны прафарыентаваныя лагеры, праходзяць злёты ў рамках Саюзнай дзяржавы, экспедыцыі ў прыродныя запаведнікі. Яшчэ цэнтр праводзіць навуковыя конкурсы аб флоры і фаўне Беларусі. У сёлетнім 35-м конкурсе праектаў навучэнцаў удзельнічалі 113 работ у дзесяці секцыях. На стэндзе праекта былі прадстаўлены зборнікі мінулых навуковых конкурсаў і справаздачы з папярэдніх экспедыцый. У іх расказваецца, напрыклад, аб выкарыстанні дронаў для ўліку колькасці птушак, экспедыцыі да праваслаўнай крыніцы ў Дзяржынскім раёне.

КНІГА ДЛЯ СЯБЕ І СЯБРОЎ

Вывучаючы адукацыйныя стэнды і наведваючы мерапрыемствы на галоўнай сцэне «БелЭкспа», мы не маглі не заўважыць мастацкую літаратуру, прадстаўленую беларускімі і замежнымі выдавецтвамі. Напрыклад, раман «Цыдулкі для Пеле» расказвае пра тое, як бацька працягвае быць у жыцці свайго сына нават пасля смерці і спрыяе яго развіццю і росту. Пеле, валодаючы фенаменальнай памяццю і веданнем энцыклапедычных фактаў, выкарыстоўвае іх у якасці апоры ў цяжкія моманты, якія дапамагаюць яму спраўляцца з горам і цяжкасцямі. «Казахскія народныя казкі» адрасаваны не толькі дзецям. Гэты зборнік ад казахскага выдання «Фаліянт» дапаможа паглыбіцца ў фальклор Казахстана і правесці вечар за вывучэннем урокаў старажытнай мудрасці і выпрабаванняў лёсу.

Падлеткавы раман маладога брытанскага пісьменніка Дафі Малкалма «Мама. Тата. Я» расказвае пра хлопца Дэні: на фоне праблем у маці і яе новага сябра Дэні адважваецца знайсці свайго бацьку, якога ніколі не ведаў. Кніга пра сталенне, пошук і сям'ю будзе цікавай і карыснай многім. Свежае выданне «Чароўны свет» ад «Белкнігі» дазволіць коратка і наглядна пазнаёміцца з беларускай міфалогіяй. А ўсім прыхільнікам беларускай культуры раю звярнуць увагу на выданне «Традыцыйны светапад беларусаў».

Літаратура такая ж розная, як і людзі, якія яе ствараюць. І самае галоўнае, каб чытанне кніг заставалася часткай нашага жыцця. Чытайце, дзе атрымліваецца, і тое, да чаго ляжыць душа! Слухайце аўдыякніжкі, чытайце ў электронным фармаце, разглядайце коміксы і беражыце папяровую кнігу. І помніце, што кніга — люстэрка душы пісьменніка, а значыць, вас заўсёды чакаюць адкрыцці.

Аляксандр ПЯТРОЎСКІ, фота аўтара.

Свой выбар

«Мае вучні — самыя лепшыя», або Як гэта — быць дырэктарам музычнай школы

У эпоху баляў і паядынкаў музычная адукацыя лічылася асновай свецкіх манер, статусу і адукаванасці чалавека. Аднак тады засвоіць прафесійную ігру на інструменце маглі толькі сапраўдныя арыстакраты. Цяпер жа кожны ахвотны, незалежна ад свайго паходжання і ўзросту, можа гэта зрабіць, прыйшоўшы ў музычную школу. Якую карысць тоіць у сабе ігра на музычным інструменце, якія напрамкі можна асвоіць, і як гэта — быць кіраўніком музычнай школы, нам расказала трыццацідвухгадовая Ірына КАСЦЮК, дырэктар школы мастацтваў Дзяржынска.

— Я — музы́ка з адукацыяй. Скончыла з адзнакай Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, аддзяленне «Мастацтва эстрады». Пачала свой шлях з педагагічнай дзейнасці, дзесяць гадоў прапрацавала настаўнікам па класе скрыпкі. Вельмі люблю сваю прафесію, ні разу ў жыцці не пашкадавала, што выбрала гэтую ніву. Менавіта дырэктарам школы мастацтваў з'яўляюся аднасна нядаўна. Прапанова ўзначаліць яе паступіла ў 2021 годзе. Гэта новы этап і новы бясцэнны вопыт, усведамленне таго, чым займаешся і якую місію выконваеш. Наша галоўная задача — выхаванне і адукацыя падрастаючага пакалення. Гэтыя мэты дапамаглі мне прыняць рашэнне і ўзначаліць школу мастацтваў. Усе мае пакуль яшчэ нешматлікія дасягненні як дырэктара ўспрымаю не як асабістыя перамогі, а як заслугу ўсяго калектыву, бо мы робім адну справу. Аднак самыя яскравыя перамогі яшчэ чакаюць нас наперадзе!

Ірына адзначае, што абавязкі дырэктара вельмі разнапланавыя. Трэба быць добрым арганізатарам, гаспадарнікам, псіхолагам, яшчэ ў гэтай прафесіі важна быць чалавекам творчым. Працаваць менавіта кіраўніком, як прызнаецца наша гераіня, вельмі і вельмі няпроста, але пры гэтым не менш цікава. У першы год у яе ўзнікала мноства пытанняў, не хапала ведаў у пэўнай сферы, бо яна атрымлівала зусім іншую адукацыю і з кіраўніцкай дзейнасцю сутыкнулася ўпершыню, давялося вучыцца на хаду. Але дзякуючы калегам, якія заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу і аказаць патрэбную кансультацыю, Ірына стала прафесіяналам сваёй справы.

— Зараз сумяшчаю дырэктарства з педагагічнай дзейнасцю, але, вядома, ужо не ў такім аб'ёме, як раней. Лічу, што вельмі важна перадаваць веды, якімі ты напоўнены. Мне ёсць чым падзяліцца са сваімі вучнямі, бо яны ў мяне самыя лепшыя!

Дзяржынская школа мастацтваў працуе па наступных кірунках: музычны, харавы, харэаграфічны і мастацкі. З 2021 года актыўна развіваецца і набірае абароты эстраднае аддзяленне.

— Важным вектарам з'яўляецца прафарыентацыйная работа. Штогод пяць-шэсць навучэнцаў паступаюць у профільныя сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, паказваючы высокі ўзровень падрыхтоўкі. Але самае прыемнае, калі выпускнікі вяртаюцца ў сцены роднай школы ў статусе настаўнікаў, каб далей працягваць свой творчы шлях.

На пытанне, што ж дае навучанне музыцы, акрамя навыкаў ігры на інструменце ці пастаўленага вакалу, наша гераіня адказала без роздумаў:

— Музыка развівае гарманічную асобу, яна ўплывае на работу мозга, маторыку рухаў, мысленне, дапамагае развіваць слых і рытм, паляпшае памяць. Упэўнена на сто працэнтаў, што чалавек, які хоць крыху дакрануўся да творчасці ў любых яе праявах, адчуў гэта на сабе. А з-за таго, што дзіцячае ўспрыманне больш адчувальнае, мысленне гнуткае і рухомае, карысць ад заняткаў узмацняецца ў шмат разоў.

Як мы ўжо казалі ў пачатку, цяпер у музычнай школе могуць навучацца ахвотныя ўсіх узростаў, аднак ёсць нюанс. З расповеду Ірыны мы даведаліся, што дзіцячы мозг валодае ўнікальнай здольнасцю апрацоўваць і ўспрымаць інфармацыю ў разы хутчэй. З узростам нашы суставы і мышцы становяцца менш рухомыя, а гэта прыводзіць да пэўных цяжкасцяў. Музы́ка, як і спартсмен, павінен увесь час падтрымліваць сябе ў рабочай форме. Але навучыцца іграць, спасцігнуць асновы цалкам пад сілу кожнаму. Галоўнае, каб было жаданне.

— Калі казаць пра класічную музычную адукацыю, то яна адназначна пераважае пэўныя змены. У свеце, які імкліва развіваецца, калі кожны дзень дыктуе новыя тэндэнцыі, цяжка ўтрымліваць лідзіруючыя пазіцыі. Я ўпэўнена, што немагчыма пабудаваць новае без моцнага падмурка. Гэта як аснова, як важнае звяно, якое нельга ўпускаць, асабліва што датычыцца адукацыі дзяцей. Вядома, электронныя музычныя інструменты цяпер заваёўваюць цікавасць у іх, гэта бясспрэчна. З вялікім задавальненнем падлеткі навучаюцца ігры на электрагітары і ў нашай школе. У нас у планах ёсць развіццё «Лічбавага кірунку», бо гэта зараз вельмі папулярна, але пытанне патрабуе дэталёвай прапрацоўкі.

Ангеліна НОВІКАВА. Фота дадзены гераіняй.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.904.
Нумар падпісаны ў 19.30 27.03.2024 г.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества частного предприятия «ЗИАНД»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
